ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 74 (2240)
17 верасня 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

50 год БССР — НАСУСТРАЧ СЛАЎНАМУ ЮБІЛЕЮ

ПРЫМАЙ РАПАРТ, СТАЛІЦА!

СЁННЯ Ў МІНСКУ ПАЧЫНАЮЦЦА ДНІ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

У Мінску пачынаюцца дні абласцей, прысвечаныя 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Гэта— своеасаблівы рапарт аб працоўных здабытках, якімі сустракаюць вобласці паўвекавы юбілей рэспублікі, аб росквіце народнай гаспадаркі і культуры за гады Савецкай улады.

Учора ў Мінск прыбыў спецыяльны поезд. З вокнаў вагонаў ляцелі звонкія песні, вясёлыя частушкі, ім падпявалі баяны. Прыехалі лепшыя людзі Брэсцкай вобласці — перадавікі прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, работнікі мастацтва, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, настаўнікі школ, удзельнікі мастацкай самадзейнасці... Абдымкі, гарачыя поціску рук, музыка і мора кветак.

Багатая і разнастайная праграма гасцей. Сёння па Ленінскім праспекце пройдзе тэатралізаванае шэсце дэлегацыі брэстаўчан. Яны ўскладуць вянкі і букеты кветак да абеліска Перамогі. А вечарам у канцэртнай зале філармоніі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё дзён Брэсцкай вобласці. Пасля афіцыйнай часткі калектывы мастацкай самадзейнасці Прыбужскага краю наладзяць вялікі святочны канцэрт.

Два дні — 18 і 19 верасня прысвячаюцца сустрэчам брэстаўчан з калектывамі прадпрыемстваў і навучальных устаноў сталіцы. Госці пабываюць у Акадэміі навук БССР, у політэхнічным і радыётэхнічным інстытутах, на радыё- і гадзіннікавым заводах, сустрэнуцца з будаўнікамі сталіцы, з творчымі работнікамі студыі «Беларусьфільм», з настаўнікамі школ. Працоўныя Савецкага раёна сустрэнуцца з абаронцамі Брэсцкай крэпасці.

У парку імя Чалюскінцаў адбудзецца тэатралізаваны паказ «Беларусь, мая песня». У кінатэатрах будуць дэманстравацца фільмы, у якіх адлюстраваны жыццё, баявыя і працоўныя подзвігі працоўных гэтага цудоўнага краю. Мінчане ўбачаць «Бессмяротны гарнізон», «Цытадэль славы», «Белавежскую пушчу» і рад іншых кінастужак.

Мастацкі салон-магазін наладжвае выстаўку работ брэсцкіх мастакоў. Вялікая фотавыстаўка пазнаёміць з поспехамі працоўных вобласці ў народнай гаспадарцы і на ніве культуры. Трэцяя выстаўка — «Брэст — сёння» раскажа пра цудоўны горад над Бугам.

У канцэртах мастацкай самадзейнасці прымуць удзел лепшыя калектывы вобласці — народная харавая капэла Брэсцкага клуба чыгуначнікаў, хор настаўнікаў Брэста, Пінскі хор палескай песні, хоры калгасаў імя Леніна і «Першага мая» Ляхавіцкага і Ганцавіцкага раёнаў, танцавальныя калектывы «Радасць», Іванаўскага раённага і Барамавіцкага гарадскога дамоў культуры, сімфанічны і духавы аркестры і аркестр народных інструментаў, камерныя ансамблі, салісты, чытальнікі.

20 верасня—закрыццё дзён Брэсцкай вобласці.

Госць Мінска—Брэсцкі народны ансамбль танца «Радасць».

Сустрэнецца з мінчанамі і народны хор калгаса імя Леніна Ляхавіцкага раёна.

У Беларускай дзяржаўнай філармоніі адкрыта выстаўка работ майстроў і фотааматараў Брэсцкай вобласці.

НОВАЯ ЯВА БРЭСТЧЫНЫ

М. ШАЎЧУК,
начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры

Таму, хто едзе да нас з Захаду праз пагранічны мост, здалёку відаць арка, а на ёй золата літар: «СССР — мір, дружба». Тут пачынаецца свяшчэнная зямля нашай вялікай Радзімы.

Дзесяткі машын са значнымі розных краін штодзень перасякаюць мост, які даўно ўжо названы мостам дружбы. Некалькі мінут язды, і позірку адкрываецца велічная панарама новага раёна Брэста. Дзевяціпавярховыя дамы-прыгажуны адлюстроўваюцца ў роўнядзі Мухаўца. Бетон анаймаваў берагі рані. Клумбы і газоны пакладлі румяны на аблічча гасцінай пустні, на якой яшчэ нядаўна было многа яроў.

Гэта — брэсцкая ява.

Сябар нашай краіны, едучы па стужцы асфальту, якая з Брэста бяжыць на Усход, яву гэтую можа ўбачыць у кожнай вёсцы, у кожным горадзе нашай вобласці. А калі б позіркам можна было адразу ахапіць і тыя мясціны, аб якіх раней гаварылі «глухаманьі», «балота», «мядзведжы куток», дык перад вачыма паўсталі б пейзажы неагляднай зелёніны асушаных земляў, салоў, новых вёсак з добраўпарадкаванымі, гарадскога тыпу дамамі, тэлевізійнымі антэнамі, што назаўсёды выцяснілі нізкія, з падслепаватымі акенцамі хаты.

А як выраслі людзі! У кожнай вёсцы працуюць дзесяткі і сотні рабочых, калгаснікаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Працоўныя справы некалькіх тысяч паляводаў, жывёлаводаў, механізатараў, рабочых прадпрыемстваў, інтэлігенцыі вобласці адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. На грудзях больш як 30-ці чалавек зяе золата Зоркі Героя Сацыялістычнай Працы.

Карэнным чынам змянілася культурнае аблічча вёсак. Зараз у вобласці працуе 619 дамоў культуры і клубаў, больш як 100 бібліятэк, 22 музычныя школы, 8 музеяў, драматычны і лялечны тэатры, пяць паркаў культуры і адпачынку, не лічачы мноства чырвоных куткоў на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах.

З кожным годам удасканальваецца, становіцца больш змястоўнай і цікавай работа асяродкаў культуры. У іх праводзяцца тэматычныя вечары, лекцыі і даклады, сустрэчы з удзельнікамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, перадавікамі вытворчасці. Няспынна растуць калектывы мастацкай самадзейнасці. У харавых, музычных, харэаграфічных і драматычных гуртках займаецца больш як 50 тысяч чалавек.

Вялікі ўклад у ідэйна-палітычнае выхаванне працоўных, у арганізацыю іх культурнага адпачынку ўносіць абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі. У яго рэпертуары спектаклі, якія расказваюць аб гераічным мінулым і сённяшнім дні нашага народа. Вялікай падзеяй творчай біяграфіі калектыву з'явілася пастаноўка «Брэсцкай крэпасці» К. Губарэвіча, якая ўжо паказана гледачам больш як 700 разоў. Калектыў тэатра асаблівую ўвагу ўдзяляе працаўнікам вёскі. Няма такога буйнога населенага пункта, дзе б не пабываў тэатр са сваімі спектаклямі.

Дні вобласці ў Мінску, прысвечаныя слаўнаму юбілею нашай рэспублікі—вялікая падзея ў жыцці працаўніковаў Брэстчыны. Работнікі культуры вобласці доўга і старанна рыхтаваліся да іх. Мы будзем лічыць сваю місію выкананай, калі працоўныя Мінска, наведаўшы нашы канцэрты, выстаўкі, застануцца задаволеныя выступленнямі самадзейных артыстаў.

Тысячы музычных інструментаў выпускаюць майстры Маладзечанскай фабрыкі. Баяны, акардэоны гэтага прадпрыемства заваявалі сабе прызнанне ў нашай рэспубліцы і за яе межамі.

Ірына Міцкевіч прыйшла працаваць на фабрыку пасля таго, як закончыла сярэднюю школу. Спачатку прыглядалася, як працуюць вопытныя майстры, а пасля і сама стала прабаваць свае сілы. Цяпер Ірына—добрая рэгуліроўшчыца музычных інструментаў, камсорг зборачнага цэха. За змену праз яе рукі праходзіць да сотні дзіцячых акардэонаў.

Фота В. ДУБІНКІ.

НАША НАТХНЕННЕ — ІЛЬІЧУ

СХОД ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пісьменнікі Савецкай Беларусі разам з усім савецкім народам рыхтуюцца да гістарычнай даты—100-годдзя з дня нараджэння геніяльнага прадаўжальніка рэвалюцыйнага вучэння Маркса і Энгельса, заснавальніка Камуністычнай партыі Савецкага Саюза—Уладзіміра Ільіча Леніна.

13 верасня адбыўся адкрыты сход партарганізацыі Саюза пісьменнікаў БССР, прысвечаны творчым і арганізацыйным задачам беларускай пісьменніцкай арганізацыі ў падрыхтоўцы да юбілею вялікага Леніна.

У дакладзе, зробленым сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. Шамякіным, у выступленнях пісьменнікаў М. Ткачова, С. Шушкевіча, А. Савіцкага і іншых падкрэслівалася, што беларускія пісьменнікі, уносячы свой уклад у будаўніцтва камуністычнага грамадства, пастаянна чэрпаюць сілы і натхненне ў неўміручых ленінскіх ідэях.

Набліжэнне ленінскага юбілею і 50-годдзя Савецкай Беларусі, якая з'яўляецца выдатным сведчаннем ленінскіх ідэй, ленінскай нацыянальнай палітыкі, ставіць перад літаратарамі нашай рэспублікі адказныя задачы па мабілізацыі ўсіх творчых сіл на стварэнне высокамастацкіх твораў, твораў высокага грамадзянскага гучання.

Першачарговая задача нашых пісьменнікаў, адзначалася ў дакладзе і ў выступленнях, — узбагачэнне і развіццё беларускай Лініяны. Беларускія пісьменнікі маюць у сваім творчым актыве нямала твораў, прысвечаных ленінскай тэме. Шырокую вядомасць і прызнанне здабылі лепшыя творы аб Леніне П. Броўкі, П. Панчанкі, А. Вялюгіна, А. Русецкага, В. Хомчанкі, П. Ткачова, прысвечаныя рэвалюцыйнай тэме раманы І. Гурскага.

Дакладчык і выступаўшыя гаварылі пра невычэрпнасць ленінскай тэмы, пра тое, што трэба ўвасобіць вобраз Леніна ў драматургіі, што хвалюючыя тэмы для новых твораў аб Леніне даюць ленінскія дакументы, якія маюць непасрэднае дачыненне да Беларусі, пісьмы працоўных і арганізацый рэспублікі, адрасаваныя Ільічу. На сходзе ішла канкрэтная гаворка аб тым, што трэба зрабіць беларускім літаратарам і іх творчай арганізацыі да ленінскага юбілею.

І. Шамякін расказаў аб мерапрыемствах, якія будуць праведзены Саюзам пісьменнікаў БССР да 100-годдзя У. І. Леніна. Сярод іх—правядзенне чарговага пленума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, на якім будуць абмеркаваны пытанні падрыхтоўкі да ленінскага юбілею, паездкі і выступленні пісьменніцкіх брыгад у глыбінных раёнах рэспублікі, творчыя камандзіроўкі і паездкі па ленінскіх мясцінах у нашай краіне і за мяжой, удзел беларускіх літаратараў у творчых конкурсах на лепшыя творы аб Леніне.

М. Ткачоў падкрэсліў, што пісьменнікі павінны прымаць актыўны ўдзел у ідэалагічнай барацьбе з ворагамі камунізма, даваць ім рашучы адпор у мастацкіх творах і публіцыстычных выступленнях.

Партыйны сход заклікаў літаратараў рэспублікі адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна стварэннем новых, высокаідэйных твораў, напісаных на высокім мастацкім узроўні, прыняць актыўны ўдзел у стварэнні мастацкай Лініяны, няспынна сцвярджаць у сваёй творчасці і грамадскай дзейнасці ідэалы камунізма.

Піліп ПЕСТРАК

ТАК МЫ ЖЫЛІ...

УСПАМІНАЮЧЫ БЫЛУЮ ЗАХОДНЮЮ БЕЛАРУСЬ

Як вядома, у 1920 годзе ў выніку Рыжскага дагавору адышла пад уладу буржуазна-памешчыцкай Польшчы заходняя частка нашай беларускай краіны, і ў ёй запанаваў акупацыйны рэжым, рэжым штодзённага прыгнёту ва ўсіх галінах народнага жыцця.

Пры тым беззямеллі, ад якога жахліва пакутвала наша сялянства, пілсудчына надзяліла зямлёй асаднікаў, пераважна «заслужаных» афіцэраў — удзельнікаў антантаўскага паходу на маладую Рэспубліку Саветаў. Узброеныя рэвальверамі, шаблямі і нават куляметамі, паселі яны на нашых беларускіх прасторах.

Беларускае школьніцтва было забаронена. Моладзь не мела доступу не толькі да вышэйшай, але і да сярэдняй асветы. Яна запаўняла лесапільныя заводы, арцелі лесарубаў. На фабрыках і заводах Заходняй Беларусі рабочы атрымліваў палавіну зарплаты рабочага ў цэнтральнай Польшчы. Паліцэйскі разгул не меў ніякага стрыму. Ліквідаваліся ўсякія рэшткі дэмакратыі, гасіліся ўсякія праявы духоўнага жыцця: спачатку былі забаронены клубы, бібліятэкі, а потым і звычайныя маладзёжныя гульні са скрыпкай, гармонікам і цымбаламі.

А ў якім стане знаходзілася мастацкая літаратура? Была яна? Развівалася? Вядома, была. Бо мастацкая літаратура — такая стыхія, якая можа з'явіцца ў найгоршых умовах — і на адкрытым паветры, і ў падзямеллі. Бо гэта непасрэдны говар душы чалавека з асяроддзем — і лепшым, і горшым, і нішто не магло гэты говар перапыніць.

Змагаючыся супраць акупацыйнага рэжыму, працоўныя Заходняй Беларусі вылучалі з сваёй масы паэтаў, празаікаў, публіцыстаў. Мастацкая літаратура зрабілася — пры ўсёй сваёй прафесійнай недасканаласці — адбіткам жыцця народа, люстрам яго настрояў, імкненняў, мар.

Літаратурны рух у былой Заходняй Беларусі на самым пачатку свайго развіцця нарадзіў напрамак, які цалкам ігнараваў класавую барацьбу, лічыў усіх беларусаў без розніцы класаў у роўнай меры абязздоленымі і наіроўваў свае вастрыё супраць польскай нацыі ў цэлым.

Камуністычная партыя Заходняй Беларусі ў цяжкіх умовах падполля рабіла ўсё, каб данамагчы сялянскім масам пераадолець сваю палітычную наіўнасць, і тым самым яна вызваляла масы з-пад уплыву, які да часу мела на іх літаратура «адзінага патоку».

На першы план у грамадска-літаратурным жыцці краіны пачалі выходзіць сапраўдныя сыны народа, выразнікі яго сацыяльных і нацыянальных інтарэсаў. Выхад з гаротнага становішча мас яны бачылі толькі ў рашучай барацьбе супраць рэжыму, у інтэрнацыянальнай еднасці ўсіх працоўных. Гэтыя змагары былі заўсёды на лініі агню ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе, запаўнялі шэрагі камуністычнай партыі і камсамола, ішлі ў турмы, цярпелі катаванні і розныя іншыя здзекі. Яны сталі натуральнымі ганцамі рэвалюцыі.

Напомню, дарэчы, што іменна гэта акрэсленне — «ганцы» — і падказала мне ў свой час, як удзельніку барацьбы, напісаць паэму, лейтматывам якой была такая страфа:

Ідуць ганцы ва ўсе канцы
Ім завірухі туляць вочы,
Ідуць яны і дні і ночы
На перахрэсткі, на капцы.

«Капцы» азначалі арыенціры граніцы... Паэма была напісана ў форме паэмы Блока «Дванаццаць». Яна загінула ў часе гітлераўскай акупацыі ў Гродна.

Дынаміка нацыянальна-класавай барацьбы высякала іскры — пісаліся вершы, апавяданні, сатырычныя абразкі. Аблічча гэтай літаратуры вызначалі барацьба супраць акупацыі і неадрыўна-злітае з ёю братэрскае адчуванне локця, якое нязменна звяртала нашы вочы на ўсход, за той «рубеж лёсу», дзе жылі свае, жылі ва ўмовах адваяванай свабоды, поўныя размаху сіл у будаўніцтве новага ладу — сацыялізма.

Моцна крываточыла граніца ў сэрцы народа, і гэты боль памнажаў шэрагі самаадданых барацьбітоў за свабоду, за ўз'яднанне, за сацыялізм.

Найбольшы ўраджай літаратурных сіл прыпадае недзе на гады 1926—1928. Яно і зразумела, бо гэта былі гады, калі на прасторах акупіраванай Заходняй Беларусі з краю ў край шумела Беларуская сялянска-работніцкая Грамада. Тады і друк быў больш легальны, а значыць, і багацейшы.

Якраз у тыя гады страляла агністымі стрэламі сатыры і гумару, не даючы панам і падпанкам спакою, славутая, любімая народам «Маланка». Выходзіў у Вільні часопіс «Родныя гоні», дзіцячы часопіс «Зорка». Пазней, па ліквідацыі «Родных гоняў», пачаў выходзіць часопіс «Калоссе», які меўся аб'яднаць усе літаратурныя напрамкі. Пры дзейнасці Грамады «барацьбяная» паэзія расла як на дражджах і знаходзіла сабе, як ніяк, месца для друку. У ёй гучалі сурмы барацьбы, сурмы абуджэння нацыянальна-класавай свядомасці шырокіх працоўных мас горада і вёскі.

Яшчэ да пачатку Грамады паспелі вылучыцца некаторыя паэты, якія выбіліся з паласы прымітыву. Так, напрыклад, Л. Радзевіч выдаў зборнік вершаў «На паняволеных гонях»: Міхась Машара—зборнік вершаў «Малюнкі»; Алесь Салагуб — «Лукішкі»; Міхась Васілёк — «Шум баравы». Пазней, недзе з пачаткам Грамады, прыйшлі ў літаратуру Валянцін Таўлай, Максім Танк, С. Світка, А. Граніт, Дуброва, Васіль Горны, Піліп Пестрак (Звястун), В. Шкодзіч, Камар, Г. Вялецкі, Ляо-Дзэ, П. Асака, Н. Тарас, М. Засім, А. Іверс і нямала іншых.

Некаторыя з памянёных паэтаў натуральна «сплылі ў Лету» ці проста адсеяліся пасля таго, як пачаліся рэпрэсіі супраць Грамады. З тых жа, хто не ператалі пісаць, толькі Міхась Васілёк і Максім Танк выдалі зборнікі сваіх твораў, але ніколі не сціхаў голас той масава-самадзейнай паэзіі, праз якую выказваліся рэальнае жыццё і настрої прыгнечаных народных мас.

Перада мной «Хрэстаматыя рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі», выдадзеная Беларускай Акадэміяй навук у 1933 годзе. Маё знаёмства з гэтай кнігай адбылося ў тым жа 1933 годзе, калі не памыляюся, у кастрычніку, на падпольных сцежках Слонімшчыны, у вёсцы Шылавічы над Шчарай. Прынёс мне яе ў канспіратыўную хату разам з падпольнай партыйнай літаратурай член акружкома Юрка Кавалеўскі, таварыш па Гродзенскай турме. Працуючы потым у Беластоцкай акрузе, Юрка трапіў другі раз у турму і быў закатаваны на смерць у Бельскай дэфензіве. Чэсць яго памяці — таварыша і друга!

Гартаю кнігу, і мінулае ажывае ў сэрцы і памяці.

Вось страфа пачаткоўца з Маладзечаншчыны, які падпісваўся псеўданімам «Стары парабак»:

Нам не трэба законаў і веры
І панскага бога не трэба нам —
Мы і без бога знаем меры,
Добрыя меры — смерць панам!

Альбо вось яшчэ радкі пачынаючага паэта Васіля Горнага, радкі хоць і не вельмі ўмелыя, але прасякнутыя пафасам барацьбы і надзеяй на вызваленне:

Турма старавякова
За местам на гары.
Не прапускаюць слова
Высокія муры.
Грымяць, шумяць віхуры
І краты гне напор.
Жыхар турмы пануры —
Ты выйдзеш на прастор!

«Жыхарамі турмы» былі ў розныя часы амаль усе рэвалюцыйныя паэты былой Заходняй Беларусі. Пісанне твораў у турмах нашымі маладымі (ды і старымі) змагарамі было, можна сказаць, масавым. І сёння, з адлегласці многіх гадоў, гэта масавая, пераважна турэмная творчасць маіх шматлікіх таварышаў і аднадумцаў, уяўляецца мне тымі нябеснымі імгліцамі, з якіх фарміруюцца зоркі.

На Лукішках выдаваўся падпольны часопіс «Краты», які друкаваўся «адмысловымі» друкарамі-каліграфістамі. Вось у гэтым часопісе і быў надрукаваны ўпершыню мой верш «Паэзія», пра які Валянцін Таўлай у тым жа часопісе напісаў харошы артыкул.

Нашы вершы Таўлай патрапляў перадаваць свайму бацьку на пабачаннях.

Тут жа, у турмах, крышталізавалася і тое, што можна назваць эстэтычнай думкай нашай рэвалюцыйнай літаратуры. Там, у Лукішках, у гадах 1935—1936 у мяне была не малая перапіска з Таўлаем аб шляхах беларускай паэзіі. Гэтая перапіска праходзіла праз партком і турком, якія заўсёды заахвочвалі нас весці яе далей. А гутарка сапраўды была нядрэнная, і многае я б цяпер аддаў, каб мець яе ў руках!

Рознымі спосабамі даходзіла да нас і беларуская савецкая літаратура. Помню, нейкім чынам папала да нас у Пружанскую турму перапісаная «Біблія» Кандрата Крапівы. Яна перапісвалася ў турмах, і калі хто-небудзь з паняволеных па сканчэнні тэрміну выходзіў на волю, яму зашывалі ў халяву бота «Біблію», каб вызваленны хлопец данёс яе ў сваю вёску, а там — каб размножылі далей.

Так мы жылі... І штодзённа адчувалі падтрымку братоў з усходу, і кожным сваім крокам у барацьбе намагаліся наблізіць час уз'яднання, каб уключыцца ў будаўніцтва сацыялізма на абноўленай беларускай зямлі.

Мы дачакаліся гэтай гадзіны: 17 верасня 1939 года прыйшла Чырвоная Армія, асвятліла свабодай душы змучаных працоўных, адчыніла турмы, дала новы і вольны ўзлёт слову ўчарашняга вязня, сённяшняга свабоднага песняра свабоднай савецкай зямлі.

МАСКОЎСКАМУ ГЛЕДАЧУ

У лістападзе ў Маскве будзе праводзіцца Тыдзень беларускіх фільмаў, прысвечаных 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. У гэты час на экранах 30 лепшых кінатэатраў сталіцы нашай Радзімы будуць дэманстравацца беларускія мастацкія і дакументальныя фільмы.

Арбудзешч, пр'мера двух мастацкіх кінакарцін студыі «Беларусьфільм» — «Іван Манаравіч» і «Годны да нестрявой». Акрамя гэтых фільмаў, масквічы ўбачаць яшчэ дзесяць кінастужак беларускіх кінематаграфістаў: «Анюціну дарогу», «Запомні гэты дзень», «Канстанцін Заслонаў», «Чырвонае лісце» «Міколка-паравоз», «Масква—Генуя», «Пісьмы да жывых», «Гарэзінніи спыніўся апоўначы» і іншыя.

Дакументалісты пазнаёмяць масквічоў з лепшымі хранікальна-дакументальнымі стужкамі. Сярод іх — «Па Беларусі» «Беларуская сюіта», «Генерал Пушча», «Дарога без прывалу», «Пакараны ў 41 годзе», «Вызваленне Беларусі», «Арлікая крыніца», «Сказ пра Мінск».

У Тыдні прыме ўдзел дэлегацыя кінематаграфістаў, у складзе якой будуць рэжысёры, аператары, сцэнарысты, акцёры і іншыя творчыя работнікі кіно. Будуць сустрэчы з гледачамі, будуць шчырыя размовы аб поспехах беларускай кінематаграфіі за 50 гадоў, будуць абмеркаваны новыя фільмы.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ

За шматгадовую работу ў партыйных і савецкіх органах і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў намесніка начальніка Упраўлення культурна-асветных устаноў Міністэрства культуры БССР Сяргея Андрэевіча Гаўрылава Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

СЕЗОН ПАЧЫНАЕЦЦА НА КОЛАХ

Дырэктар тэатра імя Якуба Коласа Г. Асвяцінскі расказвае

Вялікі гмах Дзяржаўнага тэатра імя Якуба Коласа ў гэтыя вечары выглядае прыцішаным. І няма таго святочнага святла, якое звычайна здалёк вабіць да сябе віцяблян, калі афішы абвяшчаюць чарговы спектакль або прэм'еру. А сезон 1968-69 гг. распачаўся.

Але, ён распачаўся. Ён ужо хвалюе творчых работнікаў, бо блізка наперадзе тыя непаўторныя будні тэатра, якія заўсёды нагадваюць свята, і тое свята, да якога штодзённа рыхтуюцца ўсе колісаўцы, — і акцёры, і мастакі, і сталяры дэкаратыўнага цэха, і бутафоры, і адміністратары. Сёлетні сезон праходзіць пад знакам юбілею Беларускай Савецкай дзяржавы і Кампартыі рэспублікі. І пра гэты юбілей — галоўны клопат.

— Мы пачалі сваю працу з таго, што сфарміравалі тры самастойныя трупы і вызначылі даволі далёкія маршруты гастрольных паездак па вобласці, — сказаў дырэктар тэатра Г. Асвяцінскі. — Спектакль «Часовы жыхар» нашы артысты пакажуць у семнаццаці калгасах Пастаўскага раёна. Яму, гэтаму вясёламу відовішчу, ужо апладзіравалі калгаснікі «Славы» і «Сцяга Перамогі», «Прагрэса» і «Бальшавіка». Другая брыгада выехала ў Асвею, Глыбокае, Верхнедзвінск, Докшыцы, Ушачы, Браслаў — гэта заслужаная артыстка БССР Г. Маркіна і артыст У. Кулышоў, якія іграюць «Варшаўскую мелодыю». Дарэчы, гэтая прэм'ера, здаецца, першая ў нас, якую спачатку ўбачылі не гледачы нашага роднага горада: мы сыгралі спектакль на гастролях у Палтаве, цяпер паказваем жыхарам вобласці і толькі ў кастрычніку пазнаёмім з новай работай і віцяблян. Трэцяя група артыстаў едзе ў верасні па Расонскім і Верхнедзвінскім раёнах са спектаклем «Захавай маю тайну».

Я сказаў, што першыя калгасныя гледачы ўжо апладзіравалі нашым артыстам. Дадамо — тэатр спецыяльна да гэтых гастроляў падрыхтаваў вызныя варыянты спектакляў, стварыў партатыўныя дэкарацыі. У нас быў спецыяльны агляд, ну, можна гэта назваць і генеральнымі рэпетыцыямі гастрольнага рэпертуару. Таму кожны спектакль «на месцах» будзе паўнацэнным тэатральным відовішчам. Грамадскія арганізацыі і дырэкцыя надаюць сёлетняму падарожжу тэатра па вобласці надзвычай важнае значэнне — гэта сустрэча майстроў сцэны і творчай моладзі з шырокімі масамі гледачоў напярэдадні 50-годдзя рэспублікі, справаздача калектыву перад землякамі. Выходзіць, што тэатр імя Якуба Коласа пачаў сезон на колах. Вадзіцелі аўтобусаў звяраюць маршруты па пуцёўках.

Як і нашы калегі купалаўцы, якія па традыцыі адкрываюць сезон класічным спектаклем «Паўлінка», мы пачнем выступленні на асноўнай сцэне славутым «Несцеркам» па п'есе Віталія Вольскага ў пастаноўцы Навума Лойтара. Прэм'ера гэтага спектакля, як вядома, адбылася яшчэ ў 1941 годзе. Калектыў прыкладае ўсе намаганні, каб захаваць імправізацыйную лёгкасць, дасціпны гумар і сапраўды народны характар відовішча.

А потым? Хоць гэта і таямніца наша — бліжкія і далёкія перспектывы, пра некаторыя планы тэатра раскажу коратка. Перш-наперш пра буйную пастаноўку, пра «Клопа» Уладзіміра Маякоўскага. Калі ў «Варшаўскай мелодыі» заняты два выканаўцы, дык тут будзе ўдзельнічаць амаль уся трупа. Ставіць камедыю рэжысёр Барыс Эрын у дэкарацыях мастака Аляксандра Салаўёва з музыкай кампазітара Сяргея Картэса. Пантаміму і харэаграфічныя нумары ставіць балетмайстар Атар Дадзішкіліяні.

Да 50-годдзя рэспублікі і Кампартыі Беларусі рыхтуецца сцэнічная кампазіцыя, змест якой складаюць вершы беларускіх савецкіх паэтаў. Не, мы не збіраемся рабіць толькі канцэрт накшталт «літаратурных чытанняў» або звычайны мантаж. Жанр спектакля рэжысурай вызначаецца як старонкі паэтычнага летапісу, у які арганічна ўплятаецца і роздум сучасніка пра эпоху, і пра сябе, і ўсхваляванасць удзельніка вялікіх ратных і стваральных подзвігаў нашага народа. Вершы будуць знітаваныя пэўным сюжэтам. Рабочая назва спектакля, які ставіць галоўны рэжысёр тэатра Сімён Казіміроўскі, — «Твой высокі поўдзень». На сцэне будзе таксама многа музыкі, пантаміма, жанравыя эпізоды і г. д. Калі гаварыць больш агульна пра жанр будучай прэм'еры, гэта — сінтэтычнае відовішча.

Каб акцёры набылі неабходны для такіх работ вопыт, калектыў паставіць і, гаворачы мовай тэатра, «вучэбны спектакль». Гэта вядомая камедыя Карла Гальдоні «Слуга двух гаспадароў», якую пераклаў на беларускую мову Павел Місько. Зноў-такі на сцэне загучыць музыка, якую на гэты раз стварае Барыс Насоўскі, а маладыя выканаўцы роляў будуць авалодваць тэхнікай камедыі «адэль арта», уменнем насіць стылізаваныя гарнітуры, фехтаваць, танцаваць і спяваць, адчуваць пераменлівыя і імклівыя рытмы сцэнічных паводзін...

Тут я спынюся, бо далейшыя нашы творчыя планы ў многім залежаць ад драматургіі. Мастацкі савет тэатра, рэжысура і літаратурная частка, на чале якой сёлета стаў вопытны журналіст Уладзімір Ганчароў, чытаюць навінкі, абмяркоўваюць вядомыя творы, выбіраюць тое, што можна прапанаваць менавіта нашаму калектыву.

Праз якіх два тыдні калектыў тэатра пачне сорак трэці год свайго творчага жыцця. Трэба спадзявацца — год цікавы, змястоўны, год натхнёнай працы.

Наш спец. кар.

Віцебск.

ДРЭМЛЕ ПАМЯТКА ДЗЁН, ШТО Ў НЯБЫТ УЦЯКЛІ...

СТАРОЕ—НЕ СТАРЫЗНА ● ПАТРЭБЕН ГОРАД-ЗАПАВЕДНІК ● ЯК ВЫРАТАВАЦЬ МСЦІСЛАЎСКІЯ ФРЭСКІ? ● БЯСПАШПАРТНЫ — ЗНАЧЫЦЬ БЕСПРЫТУЛЬНЫ ● ПА ПРЫНЦЫПУ ШЧУПАКА, ЛЕБЕДЗЯ І РАКА

ЦІ БЫЦЬ БЕЛАРУСКАМУ СУЗДАЛЮ?

ГЭТА — не рытарычнае пытанне, не прыём «прыгожага пісьменства». Гэта перш за ўсё гарачае жаданне мець у нашай рэспубліцы месца, дзе б можна было падзівіцца на цуды, што выйшлі з-пад рук нашых даўнейшых «муралёў» і цесляроў, пакланіцца неўміручасці таленту народа. Гэта — і перакананне, што такому ці амаль такому Суздалю быць, што ён нават ёсць, толькі трэба даць каштоўнаму каменю адпаведную аправу і шліфоўку.

Але пачну па парадку.

Я рыхтаваўся ў паездку па Магілёўшчыне. Мяне чакала сустрача з творамі дойлідаў і мастакоў мінулых стагоддзяў. Планаваў я абавязкова завітаць у Мсціслаўль, пазнаёміцца з помнікамі архітэктуры і культуры гэтага старажытнага горада, які размяняў ужо дзевятае стагоддзе. Перад ад'ездам я яшчэ раз перачытаў артыкул І. Элентуха «Школа манументальнага жывапісу? Магчыма...» («ЛіМ» ад 16 ліпеня г.г.) — пра роспісы мсціслаўскіх храмаў. Падоўгу ўглядаўся я ў здымак фрэскі «Штурм Мсціслаўля», змешчаны ў газеце. Нават тут, на газетным адбітку твор невядомага мастака ўражваў эпічнасцю і манументальнасцю. Якая ж асалода, мусіць, чакае мяне там, у Мсціслаўлі, калі я зайду ў гэты касцёл.

...На Мсціслаўль ляцеш за ўсё глядзець з-за ракі Віхры. Горад быццам узняты далонямі пагоркаў і ўзвышшаў над мясцовасцю. Домікі з каляровымі дахамі на стромых зялёных схілах гор нагадваюць і частаўчыны гнёзды, і каштоўныя камяні, нібы ўціснутыя сям-там у зеляніну для аздаблення цуда-твора прыроды. Праглядваюцца цагляныя муры і вежы — гэта касцёлы, цэрквы, манастыр. Па іх не слізганеш абыякава позіркам — умелі продкі выбіраць месца для сваіх культавых збудаванняў!

Загадчык раённага аддзела культуры А. Поклад, да якога я звярнуўся за дапамогай, крыху астудзіў мой гарачы імпэт: у касцёл з фрэскамі не так лёгка трапіць. Арандуе будынак камбінат бытавых прадпрыемстваў, у сваю чаргу, ён здае яго ў арэнду пад склады гарганДлю. А. Поклад узяўся званіць у гарганДаль, каб даведацца, у каго ключы да касцёла. Урэшце выявілася, што да дзвюх дзвярэй у загадчыцы склада Валянціны Лепяцёнак. Дзе яна цяпер ніхто не ведаў.

Пакуль Алег Іванавіч працягвае тэлефонныя росшукі, іду пабадзяцца па Мсціслаўлі...

Лаўлю сябе на ўражанні, што хаджу па незвычайным горадзе, нібы кранаю навобмацак багацейшую гісторыю гэтых мясцін. Гэтае ўражанне не пакідае ні на хвіліну — ні тады, калі ўзбіраешся вуліцамі-цяснінамі ў цэнтр горада, ні калі карабкаешся на Замкавую, Траецкую ці Дзявочую горы (кожная — клубок легенд, а матэрыялы, знойдзеныя пры раскопках замчышча, склалі ў абласным краязнаўчым музеі выдатную экспазіцыю). Яшчэ больш асязальным робіцца адчуванне гістарычнасці, калі пачціва тупаеш, задзёршы галаву, каля помнікаў дойлідства мінулага, калі хочаш і не рашаешся прасіць хлапчукоў падзяліцца таямніцай, паказаць падземны ход, па якім і сёння можна дабрацца да Віхры...

Горад на крайнім усходзе рэспублікі... Горад, які не раз руйнаваўся і татарамі, і ў міжусобнай вайне мсціслаўскіх і смаленскіх князёў, і ў час нападаў літоўцаў, уладарніцтва палякаў, якія імкнуліся скарыць свабодалюбівых гараджан, насадзіць каталіцызм.

Мсціслаўль быў важным пунктам на скрыжаванні гандлёвых шляхоў. У горадзе ўзнікалі палацы і храмы, на іх будаўніцтва зганяліся тысячы сялян. Раслі, як грыбы, пастаялыя і гасцінныя двары, купецкія склады-сховішчы, а слава пра мясцовыя кірмашы перажыла стагоддзі. (Яшчэ і зараз па традыцыі з'язджаюцца сюды па выхадных днях сяляне з бліжэйшых раёнаў Магілёўшчыны і Смаленшчыны). Развіваўся гандаль і рамёствы, расла патрэба ў грамацеях. Пад Мсціслаўлем, пры мужчынскім манастыры ў Пустынках, а потым і ў самім горадзе на сродкі праваслаўнага гарадскога брацтва адчыняюцца школы.

Барацьба дзвюх рэлігій, дзвюх культур прыкметна ў Мсціслаўлі на ўсім, асабліва на архітэктуры. І ў той жа час нават на касцёлах можна заўважыць адбітак мясцовых асаблівасцей, якія міжволі дапускаліся тутэйшымі «муралямі».

Не скора прыйшлі сюды мірныя гады. Да 1654 года, калі палкі маскоўскіх ваяводаў Пажарскага, Куракіна і Даўгарукага, падтрыманыя мясцовым людам, канчаткова выбілі адсюль палякаў, горад не раз пераходзіў з рук у рукі. У агні пажараў, ад разбурэнняў загінула шмат твораў мастацтва — жывапісных палотнаў і абразоў, разьбы па дрэве, меднай і срэбранай чаканкі. Разбягаліся або гінулі выдатныя народныя майстры. Беларускіх майстроў можна было сустрэць у той час усюды. У Маскве імі была заселена цэлая Мяшчанская слабада. У вялікай павазе быў у цара Аляксея скульптар-мсціславец Сцяпан па прозвішчы Палубес. З Мсціслаўля выйшаў і славуты прадаўжальнік Скарынінай справы, друкар і асветнік Пётр Мсціславец.

...Пад канец рабочага дня зноў заходжу да А. Поклада. На след В. Лепяцёнак пакуль што трапіць не ўдалося. Сядзім з Алегам Іванавічам, размаўляем, потым ідзём па горадзе ўжо ўдвух.

Восем сабораў і манастыроў было ў Мсціслаўлі, каля сарака — у наваколлі. Гэта вядома са старых кніг. Цяпер такіх пабудоў засталося вельмі мала. У спісе помнікаў архітэктуры горада, узятых пад ахову дзяржавы, значыцца толькі адзін касцёл з роспісамі (XVII стагоддзе). І толькі адзін гэты будынак у Мсціслаўлі мяркуюць адрамантаваць і адчыніць для паказу турыстам (Мсціслаўль уключан у турысцкі маршрут).

— Неяк у чэрвені зазваніў тэлефон, — расказваў дарогаю А. Поклад. — Інспектар абласнога ўпраўлення культуры Пракоп'еў, сказаў, што створана спецыяльная камісія, якая павінна вызначыць аб'ём рамонту касцёла, што мяне таксама ўключылі ў тую камісію. Але яна яшчэ не прыязджала да нас, а мне Пракоп'еў загадаў, прыняць пакуль што ахоўныя меры на месцы. А што я адзін магу зрабіць? Якія я магу прыняць меры?

Алег Іванавіч зноў тлумачыць мне, што будынак належыць камбінату бытавых прадпрыемстваў, а не аддзелу культуры, што нават ключы здабыць, самі бачыце, як цяжка, каб паглядзець, што там робіцца, што... Словам, шукаў апраўданні, якія толькі мог. Не ўспамінаў аднак таго, што ўжо каля года ўсе помнікі архітэктуры лічацца перададзенымі з Міністэрства будаўніцтва ў веданне Міністэрства культуры БССР, што з арандатарамі раённыя аддзелы культуры павінны былі перазаключыць арэндна-ахоўныя дагаворы. Не ўспамінаў ён і таго, што сам з'яўляецца старшынёй раённага аддзялення Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, і мог бы пры жаданні, як кажуць, цягнуць двайной цягаю...

Мы хадзілі вакол касцёла ўжо ўдвух. Шыльды, якая б сведчыла, што гэты выдатны помнік архітэктуры ахоўваецца дзяржавай, нідзе не было. Не знайшоў я ніводнай цэлай водаадводнай трубы, і патокі вады ў многіх месцах моцна папсавалі сцены. Дах, наколькі льга было згледзець збоку, правіс, сцены зверху таксама пачалі абсыпацца. Няма ніводнага цэлага акна.

У сярэдзіну касцёла нам ўдалося заглянуць толькі назаўтра. Абломкі бярвенняў, дошак, атынкаваныя глыбы — паўкругі са зводчатай столі, друз, пыл. Паўз сцены, дзе яшчэ трымаецца столь, ярусы скрынак з бутэлькамі і слоікамі. Сырасць, цвіль, тло...

Гадоў дзесяць назад былі ўзведзены рыштаванні, каб адрамантаваць касцёл. Але далей гэтага справа не пайшла. Кажуць, што рамонтнікі не адважыліся чапаць столь — зводы былі з дрэва, канструкцыі ўжо сапрахнелі, пагражалі абвалам. Па другой версіі, касцёлу з рамонтам проста не пашанцавала: настаў перыяд «барацьбы з лішкамі ў архітэктуры», і ўсе грошы, адпушчаныя на рамонт будынка, былі спісаны. Рыштаванні прастаялі больш дзесяці гадоў, столькі ж пратрымаліся зводы. Сёлета вясною ўсё абрушылася, загрувасціўшы падлогу. Абвалілася прыкладна трэцяя частка і даха.

А дзе ж знакамітыя фрэскі? Ад «Штурма Мсціслаўля» засталося некалькі ледзь прыкметных фігур па баках камапазіцыі. Ад другой, пазнейшай фрэскі, якая быццам бы паказвала расправу пераможцаў над пераможанымі, уцалела толькі невялікая частка, астатняе ўпала разам з атынкоўкай. Аднавіць іх можна, бадай, толькі пішучы занава, па фотаздымках.

Каб адрамантаваць касцёл, рэстраўрыраваць яго ўнутраны выгляд цяпер спатрэбіцца значна больш сродкаў і часу, чым, скажам, дзесяць гадоў назад. І ўсё-такі аднавіць яго трэба, гэта — справа гонару рэспублікі. Між тым, некаторыя кіраўнікі горада і раёна, у тым ліку і раённы архітэктар. А Сыты, прытрымліваюцца другой думкі: аднаўляць, маўляў, ужо няма чаго, дый не такая ўжо гэта каштоўнасць, як лічаць у Мінску.

Вось так, аднаасобна, без уліку думкі спецыялістаў, рашаўся і раней лёс многіх выдатнейшых помнікаў архітэктуры. Дый зараз карціць некаторым праславіцца. Старшыня Мсціслаўскага райвыканкома І. Рудкоў, напрыклад, думае добраўпрадкаваць цэнтр Мсціслаўля на свой манер. Вось толькі царква, на яго думку, не на месцы. У спісе помнікаў архітэктуры яна пакуль што не лічыцца, дык лепш можа ўзарваць яе?

А між тым гэтая царква заслугоўвае большай увагі. Гэта таксама выдатны помнік мясцовай архітэктуры, хай і не такіх далёкіх часоў, як касцёл. Яна добра «арганізуе» ўсё наваколле, не будзь яе, і цэнтр горада блякне. У гэту царкву так і просіцца краязнаўчы музей або база для турыстаў. Толькі трэба адрамантаваць яе, прывесці ў парадак.

Даўно трэба было звярнуць увагу і на будынак былой Падольскай царквы. Гэтая царква старэйшая, чым царква Аляксандра Неўскага. Яна здзіўляе арыгінальнасцю і дасканаласцю форм, сваімі пяццю прыгожымі купаламі, мініяцюрнымі памерамі. На жаль, цяпер і гэты будынак вельмі непрыглядны: млын і ваўчаноска, якія асталяваліся ў ёй, зрабілі сваю справу.

Цяпер ужо цяжка ўявіць, якім быў калісь ансамбль жаночага манастыра, дзе зараз размяшчаецца спецыяльная дзіцячая школа. Будынкі шмат разоў перарабляліся. Часта перабудоўвалі і езуіцкі касцёл, дзе зараз раённы Дом культуры. Але і тут ёсць яшчэ што глядзець, што паказваць турыстам.

Крыўдна і балюча, што ў свой час не захавалі ансамбля Тупічэўскага манастыра, што зарупела камусь пабудаваць на гэтым месцы маслазавод — быццам у Мсціслаўлі мала зямлі, быццам свет сышоўся клінам якраз на гэтым участку. Тупічэўскі манастыр быў галоўным асяродкам барацьбы з паланізацыяй. У манастырскую царкву наведваўся колісь са сваёй рацыю на малебен Петр І. Цар выдаў тады манастыру ахоўную грамату. У царкве Тупічэўскага манастыра захоўваўся старажытны абраз Божай маці з дзіцем, пакланіцца якому сыходзіліся багамольцы нават з чужых краёў, і на які, а таксама на фрэскі ў касцёле, двойчы прыязджаў падзівіцца са сваёй дачы ў Здраўневе Ілья Яфімавіч Рэпін. Цяпер жа з усяго Тупічэўскага манастыра засталася толькі частка вежы-брамы ды кавалак сцяны і рэшткі старажытных склепаў, у якіх былі выяўлены забальзаміраваныя мумії. Гэтыя аб'екты таксама можна было б паказваць турыстам.

Найбольш цікаўных можна было б вадзіць на раскопкі Замкавай гары, паказваць рэшткі Мсціслаўля XII стагоддзя. А рамантыкаў можна было б правесці падземным ходам да Віхры. Па расказах, гэты ход вёў у Пустынкаўскі мужчынскі манастыр, за некалькі кіламетраў ад Мсціслаўля. Туды турысты маглі б дабірацца на машынах, там таксама ёсць што паглядзець. Яшчэ здалёк відаць высачэзная і імклівая, нібы страла, пяціярусная старажытная званіца. Яна стаіць ля ўваходу на тэрыторыю манастыра. Ад манастырскай царквы, праўда, засталіся адны руіны. Уцалелі яшчэ два будынкі, у адным і сёння размяшчаецца васьмігадовая школа, другі ж, пасля таго, як адсюль выбраўся дзіцячы дом, запуставаў і пачаў разбурацца. А яго можна было б адрамантаваць і размясціць у ім, скажам, матэль-гасцініцу для турыстаў.

А такая гасцініца-матэль спатрэбіцца, я перакананы ў гэтым, як перакананы і ў тым, што беларускаму Суздалю быць. З усіх нашых невялікіх старажытных гарадоў, на маю думку, найбольш падыходзіць для запаведніка Мсціслаўль. Менавіта Мсціслаўль! Тут ёсць што расказаць турыстам, ёсць што і паказаць (давёўшы, зразумела, да ладу). Можна было б сабраць сюды з усёй усходняй Беларусі найбольш выдатныя творы драўлянага дойлідства, разьбу па дрэве, якая таксама пакуль што недаацэньваецца. (У Магілёве на вачах у супрацоўнікаў абласнога краязнаўчага музея зносяцца, старыя драўляныя дамы, вывозяцца на дровы ліштвы, карнізы, рэшткі франтонаў з тонкай і мудрагелістай, нібы карункі, разьбой, і нікому не ў голаў спыніць машыны і сказаць: «Браткі, ды што ж вы робіце!»). Гэтыя творы, якія выйшлі з-пад сякеры і пілы простых умельцаў (вось сапраўды ўжо народныя!) маглі б яшчэ не адзін дзесятак гадоў захапляць і выхоўваць людзей, вучыць любві і пашане да спадчыны нашых бацькоў і дзядоў.

ЯК ТАЎКУЦЬ ВАДУ Ў СТУПЕ...

ЦІКАВА ПРАСАЧЫЦЬ за паваротлівасцю магіляўчан. З часу, калі была прынята пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры ў Беларускай ССР» прайшоў роўна год. У Магілёве «прадубліравалі» гэтую пастанову «на вобласць» толькі ў сакавіку 1968 года — амаль праз сем месяцаў, гаркомы і райкомы партыі разам з выканкомамі гарадскіх і раённых Саветаў — яшчэ праз тры-чатыры месяцы. Раённыя аддзелы культуры пачалі варушыцца яшчэ пазней. Значыць толькі на адну раскачку, «распрацоўку» мерапрыемстваў, якія часта не ішлі далей агульшчыны — «звярнуць увагу», «павысіць», «прыняць меры да таго, каб...», сцерлі амаль год часу.

Згодна з гэтай пастановай па Магілёўскай вобласці вызначаны для рэстаўрацыі ў 1968—70 гадах акрамя Мсціслаўскага касцёла яшчэ пяць аб'ектаў: Мікалаеўская царква і будынак былога кафедральнага касцёла ў Магілёве, касцёл і гарадзішча ў вёсцы Багушэвічы, ратуша ў Чэрыкаве і царква ў Слаўгарадзе. А да рэстаўрацыі яшчэ далёка, бо толькі падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя на работы першай чаргі — збудаванне рыштаванняў і рамонт даха Мікалаеўскай царквы. Кафедральны каталіцкі касцёл толькі агледжан рэстаўрацыйнай камісіяй, якая склала акт аб'ёме рамонтных работ, і на гэтым пастаўлена кропка. Ніхто нават прыкладна не можа сказаць, калі пачнецца рамонт. Кажуць, нібыта ёсць яшчэ адзін дагавор і выдзелены сродкі на рамонт Слаўгарадскай царквы, нібыта работы пачнуцца ў чацвёртым квартале. І гэта ўсё.

Я доўга гутарыў з А. Пракоп'евым. Чамусьці кожнае маё пытанне выводзіла яго з раўнавагі, ён шукаў у іх нейкі патайны сэнс, «падкоп» і аберуч трымаўся за свае паперы, каб хаця не паказаць чаго лішняга. Ці складзены графікі рамонту і рэстаўрацыі ўсіх шасці важнейшых архітэктурных помнікаў, адзначаных у пастанове? Такіх графікаў не было, але Аляксандр Арсенцьевіч зноў напомніў, што восьвось пачнуцца работы ў Мікалаеўскай царкве. Ці заключылі аддзелы культуры арэндна-ахоўныя дагаворы з арганізацыямі, якія эксплуатуюць памяшканні помнікаў архітэктуры? «Заключылі, але не ўсе...» Ці ёсць пашпарты на помнікі? «А як жа! Усе шаснаццаць помнікаў архітэктуры, якія лічацца ў воблаці пад аховай дзяржавы, маюць пашпарты, на іншыя помнікі — запаўняюцца». (А ў абласным аддзяленні па ахове помнікаў гісторыі і архітэктуры я высветліў, што пашпарты не складзены, ахоўных — ці мемарыяльных — дошак няма). Ці выяўляюцца і бяруцца на ўлік новыя помнікі гісторыі, архітэктуры, археалогіі? Аляксандр Арсенцьевіч паказаў спіс 24 архітэктурных і гістарычных помнікаў, якія «знаходзяцца ў стадыі вывучэння».

— Я не ведаю, чаго ўсе наваліліся на Магілёўскую вобласць, — абураўся А. Пракоп'еў. — Нас вінавацяць за тое, што рэдакцыя Слаўгарадскай раённай газеты самавольна пачала будаваць гараж на тэрыторыі царквы, нават у ліпеньскай пастанове калегіі Міністэрства культуры запісана гэта. Разумееце, ад мяне ж работнікі міністэрства ўсё ўведалі, а потым запісваюць у пастанову! А там мо і было ўбіта пару калочкаў, і пасля нашага ўмяшання ўсё спынілася...

Не, паважаны Аляксандр Арсенцьевіч. З'ездзіце, паглядзіце. Адліты гэты гараж-склад з жалезабетону, і стаіць ён моцна. Рэдактар жа газеты М. Каралёў так і не разумее, ці зрабіў ён злачынства, паставіўшы замест развалюхі прыстойную будыніну пад шыферам, ці ашчаслівіў горад, «упрыгожыўшы» тэрыторыю помніка.

Кожнаму ясна, як важна весці дакладны ўлік у сваёй гаспадарцы. А мемарыяльна-гістарычная гаспадарка ў вобласці вялікая. Адных археалагічных помнікаў тут больш за тры тысячы (дакладна ніхто не ведае), ёсць сотні памятных мясцін, звязаных з гісторыяй вызваленчай і рэвалюцыйнай барацьбы, дзесяткі помнікаў архітэктуры і культуры, каля васьмісот помнікаў удзельнікам вайны. І на кожны, каб запоўніць пашпарт, трэба мець фотаздымак, апісанне, гістарычную даведку. Пашпартызацыя ж вядзецца слаба.

Паміж аддзеламі культуры, абласным краязнаўчым музеем і абласным аддзяленнем Таварыства па ахове помнікаў увесь час ідзе нікому не патрэбная спрэчка — хто і што павінен рабіць, хто каму абавязаны памагаць, а хто цягнуць асноўную столку. У абласным упраўленні культуры лічаць, што гэта — справа работнікаў краязнаўчага музея, хай, кажуць, не замыкаюцца толькі ў сваіх сценах. А раённыя аддзелы культуры, калі і памагаюць, дык гэта іх добрая ласка. Калі я пераказаў гэтую думку дырэктару музея Івану Сяргеевічу Мігуліну, той аж расхваляваўся:

— Ну, што мы можам зрабіць адны! А работы колькі! Вобласць на сотні кіламетраў, а гэтыя помнікі, асабліва археалагічныя, не ў Магілёве на праспекце. Мы і паехаць, куды трэба, згодны і парады дамо, дапаможам грашыма. Арганізаваць жа работу на месцах могуць толькі аддзелы культуры. Хай прыцягваюць аматараў гісторыі роднага краю, настаўнікаў, студэнтаў, членаў Таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры. От вы пацікаўцеся, чым займаюцца кіраўнікі абласнога аддзялення таварыства: сядзяць толькі ды лічаць узносы, радуюцца, што многа.

У сакратара ж абласнога аддзялення таварыства У. Яфрэмава свая думка:

— Так, у нас многа і калектыўных членаў, і індывідуальных — разоў у пяць больш, чым на Гомельшчыне. Але ў нас свае задачы — прапаганда помнікаў, мабілізацыя грамадскасці на іх ахову — догляд там, кветкі розныя і г. д. А запаўняць пашпарты мы ім не абавязаны, у нас, калі хочаце, свае пашпарты...

І ён падаў мне два бланкі, белы і сіні — «Картачку ўліку помніка археалогіі» і «Картачку ўліку гістарычнага помніка». — Паглядзіце, тут толькі крыху менш пунктаў, чым у пашпарце, і таксама трэба фотаздымак прыклейваць...

— Дык што — яны будуць для пашпартаў здабываць звесткі, рабіць здымкі, а следам будзеце пасылаць фатографа вы, яшчэ раз плаціць? — не ўтрываў я.

— Выходзіць, гэтак... — ціскае плячыма У. Яфрэмаў. — А лепш бы, канечне, каб у нас картачкі былі яшчэ прасцейшыя, без здымкаў. Або копіі пашпартаў, тады можна было б і аб'яднаць намаганні. А так няхай аддзелы культуры і музей займаецца пашпартамі, ім за гэта грошы плацяць. А мы што? Мы — грамадскасць, з нас многа не спытаеш...

Сорамна слухаць. Вось ужо ніколі не думаў, што добраахвотная грамадская арганізацыя, якая і створана для таго, каб памагчы ахоўваць тое, што складае памяць і славу народа, раптам пачне ўхіляцца ад супрацоўніцтва з дзяржаўнымі ўстановамі, а кіраўнікі яе будуць «біць у хамут».

Многа ў вобласці архітэктурна-гістарычных аб'ектаў, якія трэба неадкладна браць пад ахову дзяржавы. Думаецца, гэта разумеюць і ў абласным Упраўленні культуры, і ў музеі, і ў аддзяленні таварыства, але чамусьці марудзяць, спрачаюцца, упускаюць дарагі час.

П. МІСЬКО,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

Тэатр

«ПАЎЛІНКА» АБАВЯЗВАЕ

Дзівосная восень сёлета ў Мінску. І адкрыццё новага тэатральнага сезона якраз супала з цёплымі, прыгожымі днямі.

Ля ўваходу ў Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы шумна і шматлюдна. Тэатр па даўняй традыцыі адкрываецца «Паўлінкай». І як заўсёды, калі ідзе гэты спектакль, запа поўная...

Пра спектакль, пра кожнага акцёра напісана нямала. Але сёння нам зноў хочацца вярнуцца да спектакля і зноў пагаварыць пра яго выканаўцаў. Спектакль «Паўлінка» — шчаслівы. Ён з тых, што не старэюць, ён з тых, якія для кожнага новага пакалення пасвойму цікавыя. Ён увабраў у сябе невычарпальны народны гумар, у ім адлюстраваны яркія нацыянальныя характары, ён узнімае вечныя чалавечыя праблемы. І іменна таму яму суджана доўгае-доўгае жыццё.

Сёлета мы пазнаёміліся з двума новымі выканаўцамі — Г. Аўсяннікавым і А. Памазанам, якія сыгралі ролі Пустарэвіча і Быкоўскага.

Уводзіцца ў спектакль заўсёды цяжка, асабліва калі ён ідзе на сцэне тэатра ўжо 24-ы год, і асабліва таму, што ў памяці большасці гледачоў жывыя ўспаміны аб цудоўным выкананні гэтых роляў неперавзыдзенымі майстрамі беларускай сцэны народнымі артыстамі СССР Глебам Паўлавічам Глебавым і Барысам Віктаравічам Платонавым. Створаныя імі вобразы ў купалаўскай камедыі па праву можна назваць эталонам акцёрскай ігры.

Тым больш прыемна адзначыць, што Г. Аўсяннікаў і А. Памазан справіліся з нялёгкай задачай — арганічна ўпісаліся ў ансамбль «паўлінкаўцаў».

Пранцысю Пустарэвічу пад 50. Натуральна, што малады акцёр адразу ж сутыкнуўся з пэўнымі цяжкасцямі ў рабоце над вобразам чалавека, які значна старэйшы за самога выканаўцу. Генадзь Аўсяннікаў знайшоў удалы грым, цікавыя дэталі і здолеў раскрыць характар свайго героя. Асабліва прыемна, што акцёр пайшоў не ад знешняга малюнка ролі, дэталёва распрацаванага спачатку Г. Глебавым, а потым і З. Стомам, а пастараўся прасачыць унутраную логіку паводзін героя. Генадзь Аўсяннікаў іграе Пустарэвіча пасвойму.

Калі мы бачым некалькіх выканаўцаў адной ролі, няхай нават гэтыя акцёры зусім розныя па творчых магчымасцях — міжволі параўноўваеш іх. Пустарэвіч у выкананні Г. Аўсяннікава, на наш погляд, дзесьці бліжэй да вобраза, створанага Г. Глебавым, чым З. Стомам.

З. Стома падкрэсліваў у сваім героі штучна прыдуманую незалежнасць і абыякавасць. Так ён раўнадушна ўспрымаў бясконцыя папрокі сваёй жонкі. Ён нібы даўно прывык да іх і перастаў звяртаць на іх увагу. Прывык да гэтага і Пустарэвіч — Аўсяннікаў, але ў той жа час акцёр перадае нам насцярожанасць і боязь пядашчага і слабавольнага Пустарэвіча перад здаровай, нязграбнай і крыклівай Агатай. Немагчыма ўтрымацца ад смеху, калі Агата пачынае тармасіць свайго мужа, а ён, імкнучыся ўхіліцца ад кухталёў, хаваецца за яе дабротнай постацью.

Г. Аўсяннікаў стварае вобраз смешнага чалавека, які хоць і пад пятой сваёй «дабрачыннай» палавіны, але вельмі хоча быць і незалежным і смелым. Асабліва ўдалася акцёру вечарынка ў 2-м акце.

Як заўсёды, падвыпіты Пустарэвіч у цэнтры ўсіх падзей. То ён ліха і з запалам танцуе з моладдзю «Лявоніху», жартуе з дзяўчатамі, уважліва слухае чароўную мелодыю беларускай песні, то нібы незнарок, пахіснуўшыся, налятае на табурэтку і скідае на падлогу ганарыстага пана Быкоўскага, то абрывае яго з'едлівым слоўцам, жадаючы збіць празмерную пыху з фанабэрыстага шляхціца. І ўсё гэта акцёр робіць з гумарам, тактам, добрым пачуццём меры, не пераігрываючы і не захапляючыся залішнім камікаванням.

Своеасаблівая і работа другога акцёра, Арнольда Памазана. Перш за ўсё, Быкоўскі — Памазан малады. Яму 25 гадоў, якраз столькі, колькі павінна быць па аўтарскай задуме. У адрозненне ад ранейшага Быкоўскага — лысага, панашанага, які хоча выглядаць маладзейшым, Быкоўскі — Памазан падцягнуты і нават прыгожы.

А. Памазан стварае вобраз фанабэрыстага і самаўлюбёнага шляхціца, пустога і нікчэмнага ў сваёй сутнасці.

Аднак, ствараючы даволі цікавы знешні малюнак ролі, акцёр іншы раз нібы губляе адчуванне ўнутранай праўды і механічна прагаворвае тэкст. Таму некаторыя моманты ролі, пазбаўленыя псіхалагічнай глыбіні, гучаць неапраўдана і ператвараюцца ў чыста фармальную перадачу дзеяння.

Хацелася б звярнуць увагу акцёра на сцэну, калі Быкоўскі і Паўлінка спяваюць частушкі. Спачатку Быкоўскі спявае беларускую частушку, але каб не здацца мужыком, словы гаворыць з польскім акцэнтам. Але калі частушкі Паўлінкі становяцца ўсё больш іранічнымі, ён забывае аб гэтым, таму што яму даводзіцца прыдумваць адказ на яе выклік. Мова Быкоўскага мяняецца, «панскі» акцэнт знікае. Ён, як і ўсе, выгаворвае словы чыста па-беларуску. Гэта цікавы момант. Але можа акцёру варта знайсці яшчэ якія-небудзь дэталі, каб ярчэй раскрыць сапраўдную сутнасць Быкоўскага.

Прайшло ўсяго два спектаклі «Паўлінкі» ў новым тэатральным сезоне. У маладых выканаўцаў наперадзе ўпартая работа над паглыбленнем характараў сваіх герояў. Хочацца верыць, што ад спектакля да спектакля іх майстэрства будзе ўдасканальвацца і купалаўская «Паўлінка» з новымі выканаўцамі будзе яшчэ доўга прыносіць радасць нашаму гледачу. Ад усёй душы жадаем ім гэтага.

Т. ГАРОБЧАНКА.

Артысты Генадзь Аўсяннікаў (уверсе) і Арнольд Памазан рыхтуюцца да спектакля «Паўлінка».
Фота Ул. КРУКА.

УСМЕШКІ МЕЛЬПАМЕНЫ

Аднойчы

КОЛЬКІ смешнага і кур'ёзнага можа расказаць чалавек, які папрацаваў у тэатры хоць бы дзесяць гадоў! Закулісныя вясёлыя размовы звычайна і пачынаюцца вось так: «Аднойчы...».

Дык дазвольце пачаць.

ДЗЯДЗЬКА МІЦЯ

Яго прозвішча ведалі толькі ў касе, дзе выплачвалі зарплату. А так усе ў тэатры звалі яго «дзядзька Міця». Гэта быў нечым падобны да дзеда Шчукара вясёлы, мітуслівы чалавек. Да пэўнага цэху залічыць яго нельга было, таму што працаваў ён усюды і... нідзе не спраўляўся.

Аднойчы ён быў цэлы год рэквізітарам. Пасля інвентарызацыі ў цэху стварылася чорт ведае што... А тут, як на грэх, пазніўся на выхад артыст Федзя М. Скачучы праз пяць прыступак, Федзя ўварваўся ў рэквізітарскую.

— Дзядзька Міця, давай наган, спазняюся!

Наш Міця закруціўся ўюном. Але ў тым хаосе, што панаваў пасля інвентарызацыі, заблытаўся б і Шэрлак Холмс.

— Федзя, мілы! — узмаліўся ён. — Няма нагана, вазьмі ты, на прамілы бог, шашку!.. Шашкай забі яго!..

Тут яшчэ амаль што не было снегу — чуць-чуць зацерушыў зямлю. Падаў і цяпер, але вельмі нясмела, сухі і лёгкі, як пух; слабае дыханне ветру здзьмухвала яго з дарогі ў канавы, з узгоркаў — у лагчыны, на ўзлескі.

Дні два назад была тут адліга, можа, нават ішоў дождж. На дарозе стаялі лужыны; вада замерзла, але колы машын і фурманак, ногі людзей патрушчылі слабы лядок. Белыя асколкі яго звінелі пад нагамі, звінелі на дзіва меладычна — неяк проста-такі радасна.

Прыемны марозік, яшчэ больш прыемныя сняжынкі, што проста-такі з пяшчотай жывых істот садзіліся на рукі, на твар, здавалася, што яны нават цёплыя, і гэты вясёлы звон ільдзінак пад нагамі — усё хораша бадзёрыла, узнімала настрой. Адышлі начныя вагонныя сумненні: а навошта ён едзе? Каму гэта трэба?

Не, цяпер уяўлялася ўсё простым і натуральным. Адгэтуль — і настрой такі. Недарэмна ўсё яшчэ стрымліваць, зацугляць свае жаданні, парывы, тым больш, што нікому ад іх не будзе блага, а некаму ён, напэўна, можа прынесці хоць маленькую радасць.

Іван Васільевіч не стаў чакаць у цёмным і халодным станцыйным пакойчыку, пакуль развіднее. Пайшоў адразу, як толькі знік у начной далечы сігнальны агеньчык апошняга вагона.

Дарогу помніў. Праўда, спытаў у дзяжурнага па станцыі, як выйсці на бальшак. Той агледзеў начнога пасажыра падазрона, растлумачыў нехаця, туманна. Ды Іван Васільевіч хутка пазнаў дарогу сам — як толькі прыйшоў у сяло, дзе свяцілася ўсяго два-тры акны, не больш, — у самых ранніх гаспадынь.

У яго была здзіўляючая памяць на сёлы, воблік іх, «твары» ён запамінаў гэтак жа, як твары людзей. Забываўся часам назвы, як і прозвішчы, але каб завязалі вочы і прывезлі ў любое сяло, якое наведаў хоць аднойчы, ён беспамылкова сказаў бы, у якім яно раёне, калі ён тут быў, з якой прычыны, з якімі людзьмі страчаўся.

Па гэтым сяле праязджаў на «газіку» разы два ўсяго, апошні раз сем гадоў назад: не помніў, называецца яно гэтак жа, як станцыя ці неяк інакш, але адразу пазнаў школу, стары ясакар, ад якога трэба павярнуць направа, на другую вуліцу, шырэйшую, каб выехаць... выйсці на патрэбную дарогу — на бальшак з прысадамі старых бяроз.

Пятнаццаць нейкіх кіламетраў для яго, паляўнічага, — лёгкая прагулка. Калі добра размахацца, дзве гадзіны хады — і там. Але ўсё ж не хацелася прыходзіць так рана. Няёмка неяк. Дзіўнае пачуццё! Ніколі такое не з'яўлялася раней.

Таму Іван Васільевіч ішоў не спяшаючыся. Без згрызот сумнення, без трывогі, якая ў вагоне не давала заснуць, і без таго юнацкага хвалявання, што з'яўлялася раней, калі пад'язджаў да гэтых знаёмых з партызанства мясцін. Не да мясцін увогуле, мясціны не такія ўжо знаёмыя, — да Калюжыч, да яе, Надзі. Цяпер жа, як ні дзіўна, быў настолькі спакойны, але вельмі хоча быць і незалежным і смелым. Асабліва ўдалася акцёру вечарынка ў 2-м акце.

Як заўсёды, падвыпіты Пустарэвіч у цэнтры ўсіх падзей. То ён ліха і з запалам танцуе з моладдзю «Лявоніху», жартуе з дзяўчатамі, уважліва слухае чароўную мелодыю беларускай песні, то нібы незнарок, пахіснуўшыся, налятае на табурэтку і скідае на падлогу ганарыстага пана Быкоўскага, то абрывае яго з'едлівым слоўцам, жадаючы збіць празмерную пыху з фанабэрыстага шляхціца. І ўсё гэта акцёр робіць з гумарам, тактам, добрым пачуццём меры, не пераігрываючы і не захапляючыся залішнім камікаванням.

Своеасаблівая і работа другога акцёра, Арнольда Памазана. Перш за ўсё, Быкоўскі — Памазан малады. Яму 25 гадоў, якраз столькі, колькі павінна быць па аўтарскай задуме. У адрозненне ад ранейшага Быкоўскага — лысага, панашанага, які хоча выглядаць маладзейшым, Быкоўскі — Памазан падцягнуты і нават прыгожы.

А. Памазан стварае вобраз фанабэрыстага і самаўлюбёнага шляхціца, пустога і нікчэмнага ў сваёй сутнасці.

Аднак, ствараючы даволі цікавы знешні малюнак ролі, акцёр іншы раз нібы губляе адчуванне ўнутранай праўды і механічна прагаворвае тэкст. Таму некаторыя моманты ролі, пазб

БЕЗ ПАГЛЫБЛЕННЯ Ў ПРАБЛЕМЫ

У ПРАДМОВЕ да зборніка «Праблемы сучаснага беларускага мастацтва», які выйшаў пад грыфам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, сказана, што ён «напісаны на належным навуковым узроўні, узнімаючы вострыя праблемы сучаснага мастацтва» і «трэба спадзявацца, з'явіцца вартым падарункам маладых мастацтвазнаўцаў Беларусі свайму народу». Ну, як не зацікавіцца такой кніжкай, не разгарнуць яе?

Шмат гадоў я працую ў галіне тэлебачання і амаль штодня маю справу з кінавытворчасцю маіх калег. Таму я прыпаў да тых старонак, дзе гаворка ідзе пра дзесятую музу мастацтва. Спадзяваўся, што пачарпну нешта карыснае для сябе, а потым параю прачытаць і калегам.

Ды не пачарпнуў і не раю.

Вось чаму. У артыкулах, прысвечаных кінамастацтву, увогуле шмат цікавых назіранняў, слушных заўваг, ёсць і правільныя тэзісы і палажэнні. Ну, скажам, В. Нячай сцвярджае: «Каб вобраз героя набыў сапраўды мастацкае значэнне, неабходна ў першую чаргу, каб ён рашаў праблемы сапраўды жыццёва важныя, якія маюць грамадскае значэнне, цікавыя для многіх». Ці ж хто-небудзь будзе пярэчыць гэтаму? Вядома, так заўжды і ставіцца ў нашым мастацтве пытанне пра месца і значэнне героя мастацкіх твораў. Далей чакаеш, што малады даследчык паглыбіўся ў сутнасць тых з'яў у беларускім кінематографе, пра якія варта гаварыць з пазіцый навуковага падыходу, а не толькі фіксіраваць тыя або іншыя факты.

З В. Нячай увогуле згаджаешся і тады, калі яна пераходзіць да канкрэтнага аналізу твораў. Напрыклад, і сапраўды рэжысёр і драматург стужкі «Масква—Генуя» А. Спешнеў «даў камісару Бязлыкаву функцыі галоўнага героя сцэнарыя, але не ўлічыў, што ён павінен не толькі прысутнічаць на экране... а і дзейнічаць актыўна ў завязцы, нарастанні, кульмінацыі і рашэнні драматычнага канфлікту». Спыняецца ўвага на тым, што «павінна» было быць у фільме, а не на тым, што ў ім ёсць. Аднак, па-першае, пра гэта і на такім жа крытычным узроўні ўжо дастаткова пісалася ў друку і гаварылася на творчых абмеркаваннях; па-другое, наўрад ці справядліва такой фармуліроўкай намякаць на тое, што А. Спешнеў быццам не разумее задач драматургіі або ў яго не хапае творчага вопыту. Больш таго — ён жа быў і адным з пастаноўшчыкаў фільма, і, відаць, будаваў сцэнарый так, а не інакш, свядома. Магчыма, жанр кінакарціны, блізкі да белетрызаванай хронікі, і вымагаў якраз такога прыёму, ды толькі вось пры экранным увасабленні ён аказаўся не зусім эфектыўным. Даследчык і закліканы навукова ацэньваць створанае мастаком, як кажуць, паводле абраных гэтым мастаком для сябе законаў.

Тое ж самае можна сказаць і пра ацэнку фільма «Пісьмы да жывых». Зноў з В. Нячай пагаджаешся, калі яна пералічвае заганы сцэнарыя А. Кучара і стужкі рэжысёра В. Вінаградава. Не ведаю, як хто, але я з навуковай працы заўсёды хачу даведацца пра дыялектычныя сувязі паміж мастацкім вобразам, створаным пісьменнікам, і жыццёвым прататыпам. Асабліва, калі ведаю, што фільм рабіўся па дакументах. Крытык жа спыняецца на паўдарозе — яна толькі падкрэсліла тыя месцы ў сцэнарыі і ў фільме, дзе Вераніка не падобная на Веру Харужую, і абмежавалася агульнымі разважаннямі накшталт: «...на наш погляд, неабходна было перш за ўсё паказаць гераіню ў сферы грамадскай дзейнасці, раскрыць яе непарыўную сувязь з народам».

Зноў правільная думка. Ды толькі ж у артыкуле была закранута больш прафесіянальная і спецыфічная мастацкая праблема — узаемасувязі і адрозненне паміж вобразам і жывым героем. Закранута і кінута... Аналізу пэўнай з'явы няма, хаця знешнія прыкметы яго (тэрміналагічныя, ці што), як кажуць, ёсць. Паўтараю — знешнія, бо аналіз канкрэтных твораў атрымліваецца павярхоўным і спрошчаным: ідуць парэцэнзенцку ацэначныя разважанні аб вартасцях і недахопах таго або іншага фільма.

Вось, напрыклад, словы аб сцэнарыі М. Фігуроўскага «Колькі год, колькі зім...»: «Мноства эпізодаў зміняе адзін аднаго, але ніякіх драматычных канфліктаў па-сутнасці так і не завязваецца. Эпізоды нібы статычна застылі, няма ніякай дынамікі, развіцця вобразаў...». Рэцэнзенцкі штамп у навуковай працы. Зноў і зноў пра тое, чаго «няма» ў творы, а пра тое, што зроблена даволі вядомым кінематаграфістам, амаль нічога не сказана. Або такія выказванні В. Нячай — яна зусім слушна зазначае, што нашым кінематографам у вырашэнні сучаснай тэмы «не дасягнуты такія выдатныя вынікі, як, напрыклад, у адлюстраванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны». Чаму ж так адбываецца? Крытык сцвярджае: «У перыяд мірнага развіцця канфлікты... не так яўна ляжаць на паверхні... для іх пазнання і адлюстравання патрэбен глыбокі аналітычны розум, вялікае веданне жыцця і мастацкі талент». Прачытаўшы такое, хто-небудзь можа і сапраўды палічыць, што драматычныя канфлікты яўна або тайна заўсёды ляжаць на паверхні падзей. На вайне іх толькі збіраць паспявай, а ў мірныя часы гэта цяжэй. Дзіўна! Ды і навошта ў навуковай працы аўтару шукаць такія апраўданні для слабых твораў «не пра вайну»?

Трохі здзівіла мяне і арыентацыя В. Нячай — яна лічыць узорамі шматграннага паказу сучасніка такія фільмы, як «Крылы» і «Паўз вокны ідуць паязды», бо ў іх драматургі «імкнуцца паказаць... супярэчнасці чалавечай душы». Такім чынам, супярэчлівыя характары выдаюцца за панацэю ад схематызму... Думаецца, што нешта тут не так.

Чытаю яшчэ адзін артыкул — Я. Гліндзіча «Герой кнігі — герой экрана». Зноў аксіёмы. Аўтар паўтарае вядомыя тэарэтычныя погляды на прынцыпы экранізацыі мастацкай літаратуры і спрабуе пацвердзіць іх правільнасць практыкай нашага кінематографа. І робіць усё гэта вельмі павярхоўна. Артыкул трэба вызваляць ад штампаў, агульшчыны, блытаных фармуліровак.

Напрыклад, добра растлумачыўшы, што бяскрылая ілюстрацыя літаратурных твораў у кіно — гэта метад памылковы, ён нагадвае: «Стварэнне любога твора... немыслімa без творчай задумы», — і перасцерагае сцэнарыстаў і рэжысёраў ад тыповай, на яго думку, памылкі, — «пры экранізацыі літаратурнага твора аўтары кінафільма часта ставяць перад сабой другарадную (?) мэту — экранізаваць кнігу».

Але ўжо праз дзве старонкі, гаворачы аб экранізацыі аповесці П. Ніліна «Праз могілкі», як аб прыкладзе станоўчым, Я. Гліндзіч раптам забывае пра свае сцвярджэнні наконт «другараднай мэты». Чытаем: «Вызначальны канфлікт аповесці — гэта канфлікт паміж прыгнятальнікамі і народам, які яны хочуць заняволіць... У фільме захаваны гэты асноўны канфлікт...»

Далей бегла расказваецца, што «вакол галоўнага канфлікту групуюцца пабочныя, якія нібы выцякаюць з галоўнага...» І потым ідзе заключэнне: «Але калі ў кнізе галоўным была прысутнасць менавіта гэтых (якіх? — **А. Б.**) філасофскіх разважанняў аўтара, дык у фільме ўсё падпарадкавана думцы аб усенароднасці партызанскай барацьбы». Значыць, «вызначальны, асноўны, галоўны канфлікт» захаваны, але... І ўсё ж, аказваецца: «Фільм «Праз могілкі» ніяк нельга абвінаваціць у... мастацкай залежнасці» (ад аповесці — **А. Б.**). Калі «нельга абвінаваціць», значыць, гэта добра. І не толькі ў дадзеным выпадку. А ці так?.. Занадта многа ведаем мы экранізацый (ад Чэхава да Хемінгуэя), на якіх згубна адбілася адсутнасць гэтай самай «залежнасці».

Калі не лічыць некалькіх «арыгінальных» фармуліровак, якія не маюць адносін да экранізацыі і літаратуры, — накшталт таго, што рэжысёр стварае «адзіную манеру акцёрскай гры» або што існуе «дакладны кінематаграфічны прыцэл да тэмы», — ні шырокаму колу чытачоў, ні работнікам мастацтва больш з артыкула ўзяць няма чаго. Што ж такое экранізацыя, паводле Я. Гліндзіча не зусім ясна. Праблема засталася, як кажуць, за кадрам.

Артыкул Г. Падбярэзскага, «Героіка-патрыятычная тэматыка ў фільмах Ул. Корш-Саблі́на» добры, бадай, адным: напісаны без прэтэнзій. Прачытаўшы дзевяць старонак пра Ул. Корш-Сабліна, мы даведваемся, што ён пастаянна «пераадольвае» схематызм сцэнарыяў. Творчае «я» рэжысёра раскрываецца даследчыкам пры дапамозе такіх разважанняў — «рад сцэн... быў зроблены ўпэўнена і прафесіянальнай рукой» («У агні народжаная»); «мізансцэна будуецца ў плане канкрэтнай сацыяльнай характарыстыкі; **панаватарску** выкарыстаны гук, як **новы**... выяўленчы сродак» («Першы ўзвод»). Артыкул напісаны канцылярскай мовай, стракаціць сэнсавай недакладнасцю слоў, накшталт: «Рэжысуру «Чырвоных лісцяў» можна параўнаць з мастацкім падмуркам, на якім трымаецца цудоўны, хвалюючы фільм»; «**Кульмінацыйная вяршыня** фільма — эпізод у судзе».

Што прынёс свайго Ул. Корш-Саблін у вырашэнне героіка-патрыятычнай тэмы? Чым узбагаціла гэтая тэма яго — мастака — і як пад яе ўплывам фарміравалася творчая індывідуальнасць гэтага рэжысёра, мы так і не ведаем. Цікава, што Г. Падбярэзскі заканчвае артыкул словамі: «Разглядаючы развіццё гэтай тэмы ў творчасці Ул. Корш-Сабліна, можна прасачыць...» Вось іменна. Можна. І трэба.

Работай Г. Ратнікава «Сучаснік у беларускім дакументальным кіно» ў зборніку аддаецца апошняя даніна дзесятай музе. І зноў такі з дапамогаю збітых банальнасцей. Што, робячы дакументальную кінастужку, «інсцэніраваць факт», як гаворыць аўтар, дрэнна, гэта абарочваецца на экране, як правіла, адкрытай «ліпай», — вядома даўным даўно. Што сучасныя кінадакументалісты стараюцца здымаць «схаванай камерай» або метадам працяглага назірання — таксама не навіна. Што ў фільмах вытворчыя працэсы не павінны засланяць сабою галоўнага — чалавека з яго лёсам — пра гэта і да Г. Ратнікава напісана мноства артыкулаў.

Праўда, ёсць у артыкуле «Сучаснік у беларускім дакументальным кіно» і карыснае — гэта сістэматызаваны агляд твораў нашых дакументалістаў за сем гадоў, асобныя ацэнкі работы аператараў, сцэнарыстаў, рэжысёраў... Але ж і сярод карыснага сустракаеш дзіўнаватыя «перахлёсты», як скажам, там, дзе сярэдні фільм «Апошні хутар» абвяшчаецца **«прынцыпова** новым рашэннем сучаснай тэмы». «Апошні хутар» здымаўся ў 1962 годзе і тады ж знік з экранаў, не пакінуўшы хоць якога-небудзь следу ў беларускім дакументальным кіно. Што ж гэта за «наватарства»?

Штучна, на мой погляд, выглядае ў артыкуле падзел на «дзве групы» нарысаў, створаных нашымі дакументалістамі. Калі верыць Г. Ратнікаву, дык у нас ёсць фільмы-нарысы «першай групы, а ў яе ўваходзіць большасць фільмаў і да яе адносяцца тыя творы, аўтары якіх... здымаюць сваіх герояў з дапамогай інсцэніровак і арганізацыі факта». Другую групу фільмаў даследчык вызначае наступным чынам — «фільмы, адзначаныя ў нейкай меры творчымі пошукамі» (чаму «ў нейкай» — не тлумачыць). Атрымліваецца на дзіва катэгарычны падзел. Бо поспех або няўдача тых фільмаў, пра якія напісаў Г. Ратнікаў, у значнай ступені залежалі ад глыбіні і арыгінальнасці сцэнарыяў і ад сапраўднай творчай або адкрытай рамесніцкай працы рэжысёраў. Увогуле спрэчнае пытанне — ці заўсёды «наватары» пазбягаюць інсцэніроўкі і арганізацыі факта, а «традыцыяналісты» знарок адмаўляюцца ад творчых пошукаў. Што ж датычыцца аналізу фільмаў, пра якія вядзе гаворку Г. Ратнікаў, ён не дае пераканаўчых падстаў рэзка падзяляць фільмы беларускіх дакументалістаў 1958—65 г г. на такія супрацьлеглыя групы.

Недарэчнасці і прыблізныя фармуліроўкі, на жаль, сустракаеш ва ўсіх артыкулах, прысвечаных кінамастацтву.

Кола пытанняў, якія разглядваюць аўтары зборніка, даволі шырокае, і закранаюць яны амаль усе віды мастацтва. Таму кніжка, мабыць, прыцягне да сябе ўвагу і мастакоў, і пісьменнікаў, і кінадзеячоў, і тэатралаў. Мне здаецца, што любы спецыяліст-прафесіянал у кожнай з галін мастацтва наробіць на палях зборніка заўваг не менш за мяне.

Выдавецтва «Навука і тэхніка» магло б больш патрабавальна паставіцца да матэрыялаў, якія склалі зборнік.

А. БРАІЛОЎСКІ.

«Праблемы сучаснага беларускага мастацтва». На рускай мове. Зборнік артыкулаў. Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск. 1968.

НАВІНКІ КНІЖНАЙ ГРАФІКІ

Малюнкі мастака А. Дэмарына да кнігі М. Лермантава «Выбраная паэзія» (пераклады А. Кулешова), якая выходзіць у выдавецтве «Беларусь».

ПРА НЯСВІЖ І ЯГО ЖЫХАРОЎ

У ВЫДАВЕЦТВЕ «Беларусь» выйшаў фотаальбом, прысвечаны старажытнаму беларускаму гораду Нясвіжу. У ім — 85 фотаздымкаў, зробленых вядомымі беларускімі майстрамі фатаграфіі В. Дубінкам, У. Дагаевым, З. Пазняком, А. і М. Ананьінымі, М. Гуціевым, і невялічкі нарыс пра Нясвіж, напісаны Янкам Казловым.

Ці здолелі аўтары альбома расказаць нам пра горад, пра яго слаўнае мінулае і пра захапляючую сучаснасць?..

Фатаграфія — рэч каварная. Яна ніколі не даруе абыякавых адносін да сябе. Калі фотамайстар не ўкладае ў кожны кадр фантазію, выдумку, разуменне стылю і характару прадмета, які здымае, калі ён не стараецца скампанаваць кадр так, каб вызначыць галоўную тэму і адсекчы ўсё лішняе і выпадковае, то мы, гледачы, застаемся халоднымі, гэты здымак нас не хвалюе, ён не з'яўляецца творам мастацтва; у лепшым выпадку ён проста канстатуе — маўляў, гэты дом стаіць тут, ён мае такі выгляд — не больш...

На мой погляд, шмат здымкаў фотаальбома «Нясвіж» грашаць халоднай ілюстрацыйнасцю, абыякавасцю. На жаль, немагчыма гаварыць пра кожнага з аўтараў здымкаў паасобку, бо ўкладальнікі альбома не палічылі патрэбным указаць, які здымак каму належыць, а абмежаваліся агульным пералікам аўтараў.

Калі глядзіш альбом, складаецца ўражанне, што фатаграфіі ў ім падпарадкаваны аднаму — жаданню сказаць як мага больш, ахапіць усе тэмы, усе факты жыцця горада.

Альбом пабудаваны храналагічна. Пачынаецца ён са здымкаў старажытных палацаў, з гравюр далёкіх часін і, паступова разгортваючы «экспазіцыю», даходзіць да нашых дзён. Ну, калі ўжо пачалі будаваць кампазіцыю альбома такім чынам, то, напэўна, патрэбна было шырока скарыстоўваць дакументальныя фатаграфіі, якія захоўваюцца недзе на паліцах архіваў. Гэта было б апраўдана і кампазіцыйна і эмацыянальна, бо заўсёды фатаграфія-сведка хвалюе больш, ды і ўяўленне аб мінулым часе дае лепшае, чым надуманыя і наіўныя здымкі накшталт таго, пад якім стаіць подпіс: «Падзеі, што прынеслі свабоду працоўным, жывуць у людской памяці. Яны — у граніце і бронзе». Я разумею: аўтар зрабіў гэты здымак дзеля таго, каб мы даведаліся, што з раз'езда Хваёва ў 1917 годзе на дапамогу мінскім бальшавікам выйшаў бронецягнік. Для гэтага ён уціснуў у адзін кадр і назву раз'езда, і мемарыяльную дошку, і яшчэ двух чалавек, якія, быццам бы ўважліва чытаюць гэтую дошку. Навошта гэта? Калі аўтар проста паведаміў нам аб выпадку, што адбыўся ў гэтым месцы 29 кастрычніка 1917 года, дык ці не лепш было б абыграць гэты выпадак у тэксце? У кожнага ж жанру ёсць свае законы. А ў гэтым здымку як-раз парушаны асноўныя прынцыпы як мастацкай, так і рэпартажнай фатаграфіі: даставернасць таго, што адбываецца, непасрэднасць, мастацкі падыход.

Дарэчы, вось што яшчэ кідаецца ў вочы. Калі ў альбоме добрыя пейзажныя здымкі, калі прыгожа сфатаграфавана архітэктура, то здымкі людзей, нашых сучаснікаў, амаль усе няўдалыя. Вазьміце любы з іх. І ў кожным прымеціце, што аўтары (прабачце, я вымушаны гаварыць «аўтары», бо не ведаю, чые гэта здымкі) не могуць або не жадаюць зазірнуць ва ўнутраны свет чалавека. І ў які ўжо раз ізноў канстатуюць факт: гэты чалавек — зваршчык, у яго абаронны шчыток, гэты — свідравальшчык, бо стаіць за свідравальным станком, а гэты — паэт, бо прыгожа трымае кніжку. А вось гэты, у бярэце, з пэндзалем — канечне ж, мастак!.. Зразумела, што такі спрошчаны паказ людзей і іх прафесій не дае нам уяўлення аб глыбокім і змястоўным жыцці, якім жывуць у Нясвіжы.

І ўсё ж фотаальбом «Нясвіж» — цікавы, патрэбны, павучальны. У ім адчуваецца жаданне неяк па-новаму скампанаваць матэрыял, звязаць яго цікавым, не парадным тэкстам, адысці ад трафарэтаў, зрабіць кнігу прывабнай, зручнай, змястоўнай.

Зараз, напярэдадні 50-годдзя БССР, напэўна трэба чакаць выхаду ў свет яшчэ некалькіх выданняў такога плана. Хацелася б, каб яны не паўтаралі тых недахопаў, якія ёсць у альбоме «Нясвіж».

Б. ВУС.

СТАРОНКІ ДАЛЁКАЙ МІНУЎШЧЫНЫ

Чатырнаццатае стагоддзе. Як жылі нашы продкі? Што турбавала іх тады?.. Узнавіць гэты далёкі час, «час гераічны, цяжкі і былінны», дапамагае нам паэма Пятра Бітэля «Замкі і людзі», якая нядаўна выйшла ў выдавецтве «Беларусь».

Дагэтуль мы ведалі П. Бітэля як кваліфікаванага перакладчыка Міцкевіча, Гётэ, Шылера, Гейнэ, а зараз ён парадаваў нас добрым творам аб нашай далёкай мінуўшчыне.

П. Бітэль. «Замкі і людзі». Паэма. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1968.

Паэт узяў невялікі адрэзак гісторыі — падзеі, якія адбываліся ў Вялікім княстве Літоўскім у апошнія гады панавання Альгерда, у перыяд вялікакняжання Кейстута і на пачатку ўзвышэння Ягайлы.

Як паказвае аўтар, гэта быў складаны час, калі шла не толькі родавая, міжусобная барацьба паміж князямі, але і класавая барацьба, а таксама барацьба рэлігійная.

У творы шырока прадстаўлены героі з народа. Так перад намі праходзіць лёс сялянскага хлопчыка Вайдзілы, які стаў адважным воінам Альгердавага войска, адукаваным чалавекам, дыпламатам, прыхільнікам і абаронцам гаротнага люду. Шчыра і непасрэдна перадае паэт лірычны настрой Вайдзілы, яго роздум:

— Я самы просты чалавек.
Я жыць хацеў бы ў гэткі век,
Бо я ўсё ж веру ў светлы час,
У час братэрства, ў час спакойны.
Калі, хоць, можа, і не ўраз,
Але навек зацхнуць войны...

Каларытная фігура кіраўніка сялянскага атрада паўстанцаў Няжылы. Увасабленнем народнай разважлівасці, дабраты і гасціннасці з'яўляюцца дзед Мірон, сяляне Астап і Паланея.

Аўтар рознабакова падыходзіць і да абмалёўкі прадстаўнікоў вышэйшых слаёў грамадства. Князя Альгерда, напрыклад, мы бачым чалавекам моцнага характару і дзяржаўных інтарэсаў: Альгерд заўсёды ў раз'ездах і паходах, у бітвах з крыжакамі, з Ардой. А князь Кейстут больш адданы мірнаму жыццю, яго «маніла багацце», якім ён і «мераў вартасць турбот». Пераканаўча паказвае паэт дзейнасць каталіцкіх місіянераў на літоўскіх і беларускіх землях. З любоўю гаворыць ён аб вайдалотах, народных песнярах Літвы; мы чуем іх песні, у якіх пранікнёна гучыць наказ шанаваць «звычаі, абрады дарагія», не забываць родныя мелодыі, што перайшлі ад дзядоў.

Наша паэзія ўзбагацілася цікавым эпічным творам на гістарычную тэму — паэмай Пятра Бітэля «Замкі і людзі».

Л. МІРАЧЫЦКІ.

Вокладкі новых кніг: «Сонца за кратамі» М. Машары (мастак І. Давідовіч), «Тартан» І. Пташнікава (мастак В. Сакалоў), «Абнаўленне» Р. Тармолы (мастак Б. Забораў), якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь».

ны, што нават думаў пра іншае — пра сёлы, пра іх выгляд. Гэта натуральна: усё жыццё, па абавязку службы і больш — па-чалавечаму абавязку, ён думаў пра людзей, што робяць хлеб. Як яны жывуць. І як павінны жыць.

Думаў, што пасля вайны нямала будавалі. Адзін з яго знаёмых — эканаміст падлічыў, што па агульных затратах за дваццаць пасляваенных гадоў у сяле набудавана больш, чым за ўсё стагоддзе, якое ахоплівае тры гістарычныя фармацыі — феадалізм, прыгонніцтва, увесь перыяд капіталізму з яго ўздымам і падзеннем, і першыя гады сацыялізма. Аднак выгляд сёл яшчэ мала ў чым змяніўся, асабліва тут, на Палессі. Усё тыя ж пачарнелыя драўляныя хаты ў сёлах, якія не гарэлі, ураслі ў зямлю, большасць стрэх — саламяныя. Але не лепш і ў тых сёлах, якія спалілі карнікі ці фронт. Людзі будаваліся адразу пасля вайны, па беднасці, без мужчын — удовы ды сіраты; ляпілі хаціны хто з чаго: распілаваць бервяно было праблемай; пакрыць — яшчэ большай, на сядзібах выраслі жыта і жалі сярпамі, каб мець кулі сломы — старажытнейшы дахавы матэрыял.

Усе затраты калгасаў, дзяржавы ішлі на вытворчае будаўніцтва. Матэрыяльна-тэхнічная база — аснова, гэта разумелі ўсе, кіраўнікі і радавыя калгаснікі. Калі глядзець не на хаты, а на фермы, майстэрні, элеватары і асабліва на тыя машыны, што працуюць у полі, — о, якія змены адбыліся ў сяле! Індустрыяльная рэвалюцыя! Калі ён, Антанюк, ездзіў у Англію і, знаёмячыся з фермамі, заходзіў у кароўнікі, яго мала што здзіўляла і ўражвала, хіба толькі лепшая якасць збудаванняў і абсталявання. Але размах, памеры зусім не тыя, што ў нас. Іншая рэч, што мы не навучыліся яшчэ па-сапраўднаму кіраваць такімі буйнымі гаспадаркамі, па-навуковаму, з эканамічнымі разлікамі. Колькі было гэтага самага валюнтарызму! Нямала і ён, Антанюк, аграном рабіў глупства, выконваючы ўказанні людзей, якія не нюхалі агранаміі. Але часам, чорт вазьмі, меў сілу і запратэставаць на поўны голас. Палучаў шышкі. Балелі бакі. Ды затое лёгка рабілася на душы. Як цяпер... А цяпер лёгка? Не зусім.

Матэрыяльна-тэхнічная база — аснова. Але калі ўмовы жыцця людзей пачынаюць адставаць... узнікаюць з'явы, якія ў філасофіі называюцца дыялектычнымі супярэчнасцямі. Любы новы завод-гігант, самы дасканалы па абсталяванню, не змог бы нармальна працаваць, каб побач з ім не вырастаў горад для людзей, сучасны горад — на ўзроўні тэхнічных дасягненняў завода.

Так і з калгасамі, з сялом увогуле.

Антанюк упэўнены, што наступіў ці вось-вось наступіць час, калі ў сяле трэба будзе па-сапраўднаму заняцца бытам людзей. Гэтага вымушаюць многія праблемы, якія ўзнікаюць у калгасах. Без вырашэння іх нельга рухацца далей. І не толькі цяпер, у начным полі, але не аднойчы і раней у цёплай утульнай гарадской кватэры рабілася сумна ад думкі, што цікавейшая работа па перабудове сяла будзе праходзіць без яго ўдзелу. А ён здольны яшчэ нешта падказаць, ды і арганізаваць... Праўда, ёсць спакуса ў той свабодзе, якую адчуў за час пенсіянерства. А можа так нараджаецца псіхалогія дармаедства, і гэтак апраўдваецца высокімі матэрыямі? Усё жыццё тлумачыў сам сабе і дзецям, што не можа быць ніякай свабоды ў гультая, што па-сапраўднаму свабодны толькі той, хто працуе творча, з радасцю, з карысцю для людзей і для сябе.

«Не па сваёй волі я дармаед».

«Але ты пачынаеш ужывацца ў гэтую ролю, як акцёр. Яна падабаецца табе».

«Не, я хачу працаваць».

«І ставіш умовы, якія другім людзям цяжка прыняць».

«Я маю права ставіць такія ўмовы. Само жыццё паказала, хто з нас лысы...»

«Многа думаеш пра сваё самалюбства. І забываеш, што яно ёсць і ў тых, ад каго залежыць вярнуць цябе на работу ці пакінуць радавацца «ўнутранай свабодай».

«Ім хочацца растаптаць мой гонар».

«Ты ўзнімаеш свой гонар, як сцяг».

«Не, У мяне адзін сцяг. Я нёс яго праз усё свядомае жыццё. І нішто не выбіла яго з маіх рук».

«Дык чаго ты пакутуеш? Усё адно — на два гады раней ці на тры пазней ты павінен уступіць месца маладзейшаму...»

«Каму? Таму, хто думае не пра гэтых вось людзей, а пра тое, як бы хутчэй прабіцца ў навуку?»

«Навука таксама памагае гэтым людзям».

«Зноў ты супярэчыш сам сабе».

«Такая сутнасць чалавека, які ўмее думаць. Ён увесь на супярэчнасцях. Адмаўленне і сцвярджанне... Прымірэнне з усім можа спыніць яго поступ. Што здарылася б, каб я назаўсёды застаўся стаяць тут, у полі, глядзеў бы на тыя агеньчыкі, слухаў бы, як брэшуць сабакі і ніколі не здолеў бы дайсці да людзей. І да сваёй мэты. А яна там, дзе людзі. Яна вядзе мяне, мая мэта, я не стаю пасярод поля...»

У вёсцы, у якую ўвайшоў Іван Васільевіч, узнялі дзікі вэрхал сабакі.

Адзін як гаўкнуў, пачуўшы чужога, так і пакацілася хваляй з двара ў двор. Цэлы сабачы хор — басы, тэнары, маладыя падгалоскі: адзін брэша з падвываннем, другі — так залівіста, што, здавалася, вось-вось захлынецца ад уласнага енку. Івана Васільевіча даўно здзіўляла нераўнамернасць дваровай варты. Кароў, свіней амаль аднолькавая колькасць на двор усюды. Ёсць, праўда, зоны багацейшыя і бяднейшыя. А вось сабак... Адну вёску пройдзеш — ніводнае шчанё не цяўкне. А ў другой, суседняй, зусім не багацейшай, — у кожным двары па пёсу, як тут вось. Чым вытлумачыць? Традыцыяй? Праўда, няроўна яшчэ гусей. Але гусі ўсё-такі там, дзе жывуць багацей. Гусіныя вёскі выдзяляюцца сваім знешнім выглядам.

Сустрэлі тры маладзіцы ў ватоўках, цёплых хустках. Антанюк адразу здагадаўся, куды яны ідуць у такую рань.

— Даіць? — спытаў, прывітаўшыся.

— А то куды яшчэ бабам ісці да відна? — адказала старэйшая.

— Што вы сабак столькі нагадавалі?

— Дабра ў нас многа, баімося — пакрадуць. Другая засмяялася.

— То нашы мужыкі сабак навялі, каб чужыя не лазілі. Вось ты. Хто цябе ведае, адкуль ты бяжыш з начы. Можа, ад нашай Ганны.

Зарагаталі ўсе трое.

Іван Васільевіч прытворна ўздыхнуў:

— Адбегаў я сваё, кабеткі!

Наблізіліся — зазірнулі ў твар. Тая, рагатуха, падбадзёрыла:

— Ды не — нішто яшчэ мужчына. Шустры.

Старэйшая спытала сур'ёзна:

— З поезда?

— З поезда.

— Куды?

— У Калюжычы.

— То мо ж ёсць да каго спяшацца, што пабег са станцыі, калі ваўкі па полю гуляюць.

І вось пасля выпадковай гэтай размовы прыйшло яно, хваляванне, зразумелае, але ўсё ж дзіўнае — уразіла сваёй нечаканасцю. Што да чаго? Чаму сэрца раптоўна дрогнула, затрапятала амаль гэтак жа, як тады, калі Надзя пасля высялення вярнулася ў лагер з Вітай на руках, у лахманах жабрачкі? І цяпер, як тады, узнікла і радасць, і трывога.

Хацеў скіраваць думкі на іншае — пра гэтых жанчын, даярак. Таксама адна з праблем, над якой ён сур'ёзна задумваўся і спрабаваў нешта зрабіць, — каб праца даярак, бадай, самая цяжкая з усіх жаночых прафесій на фермах, зрабілася лягчэйшай. Балела сэрца, калі маладыя жанчыны паказвалі яму свае рукі. А іх рабочы дзень? Цяпер, зімой, ідуць крыху пазней, хоць відаць, мала хто з мужчын яшчэ прамыў вочы. А ўлетку ў гэтых жанчын рабочы дзень — з чатырох гадзін раніцы да адзінаццаці вечара. Добра, калі кароўнікі блізка. А калі трэба ісці дзве і тры вярсты...

Не аднойчы выступаў на нарадах, лаяў канструктараў даільных апаратаў, разносіў «ёлачкі» і «каруселі», — ведаў, што ўсе гэтыя наватарствы кабінетнага паходжання, як круглыя кароўнікі і торфаперагнойныя гаршчочкі. Пры даярках яму апладзіравалі. А пасля за спіной пасміхаліся:

«Дзівачыць стары. Папулярнасць зарабляе. Не разумее, што яго народніцкія замашкі не ў нагу з часам... Што, па сутнасці, гэта выступленне супраць механізацыі...»

На той «антытравяной» нарадзе сказалі пра гэта ў вочы, з трыбуны, пад воплескі прэзідыума.

Хацеў паразважаць пра сельскія праблемы, паспрачацца са сваімі апанентамі, хоць, праўда, цяпер яны раптам паразумнелі — самі парабіліся «народнікамі» і «эканамістамі». Хацеў... Не выйшла. Перад вачамі стала Надзя, засланіла ўсё. Ішла да яго. Ці ён ішоў да яе... А яна чакала. Розная. Спалоханая... Радасная... Сумная... Сарамлівая... Якая стрэне яго цяпер?

Доўга ў паветры плавалі асобныя сняжынкі, нябачаныя ў начным змроку. Калі пачало днець, лёгкія, пушыстыя, яны закружыліся гусцей. Адразу пабялела дарога. Ці можа таму так раптоўна і развіднела, што ўсё навокал пабялела? Толькі дымы над камінамі жоўтыя — палілі торфам.

Па вуліцах беглі школьнікі, з цікавасцю азіралі незнаёмага. Спыняліся жанчыны, каб не пераходзіць дарогу з пустымі вёдрамі. З поўнымі спяшаліся перайсці. Потым ужо аглядваліся.

Кранула гэта Івана Васільевіча. Людзі зычаць удачы. Пазнаюць ці проста так? Ён вельмі даўно не быў тут зімой, гадоў пятнаццаць. Тады здавалася ўсё натуральным — сяло як сяло, шчаслівае — не гарэла, зберагла партызаны. Цяпер уразіла голая вуліца і голыя гароды.

Хата за маладымі зялёнымі клёнамі была ўлетку такой утульнай і па-свойму прыгожай — адна з лепшых на вуліцы. Цяпер жа ледзь пазнаў яе — здалася голай, сіратліва ўбогай, хоць клёны выраслі. Але цяпер ад іх мала хараства. Па-новаму зашчымела ў сэрцы: вось яны, прыкметы старасці. Ці не могуць раптам здацца такімі ж голымі і ўбогімі і пачуцці? Свае ўласныя самому сабе. Твае — ёй. Ці яе — табе. Такая думка спалохала, з ёй цяжка пагадзіцца. Няхай жаўцеюць і асыпаюцца дрэвы. Прыйдзе час — яны зазеляняюць зноў. Няхай чарнеюць сцены хат, няхай трухлеюць — іх лёгка паднавіць... Нарэшце, збудуюцца новыя... А як аднавіць тое, што доўга жыло ў сэрцы, і... патухла, як забыты людзьмі касцёр? Але ў прысаку могуць тлець вугалі...

Заканчэнне ў наступным нумары.

ПІСАЛІ ПІСЦЫ Ў СУПРАСЛІ...

З ЛЕТАПІСУ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

АБ ПІСЬМОВАЙ музычнай культуры Беларусі вядома нямнога. Надзвычайная раскіданасць архіваў робіць цяжкім вывучэнне гэтага пытання. Мне хочацца расказаць аб тым нямногім, пра што ўдалося даведацца, прачытаць, знайсці і што, можа, падштурхне музыказнаўцаў і на далейшыя пошукі дакументаў, якія дапамогуць скласці больш поўнае ўяўленне аб узнікненні культуры прафесіянальнага харавога спявання ў Беларусі, аб яго своеасаблівасці і традыцыях.

Ці можна ўсю пісьмовую музычную культуру Беларусі XVII—XVIII стагоддзяў адносіць да адной толькі культавай, царкоўнай? Факты паказваюць, што нягледзячы на вельмі значную ролю культавой традыцыі ў гэту эпоху, такі вывад быў бы паспешлівым. Многія вядомыя нам запісаныя крукамі з кінаварнымі паметкамі або старажытнай кіеўскай нотацыяй напевы гімнападобнага, кантавага складу не толькі ніколі не выконваліся ў царкве, але і самім зместам вызначалі перш за ўсё сваю публіцыстычную, грамадскую накіраванасць. Такі быў напісаны ў няволі гнеўны, выкрывальны гімн «Даруй покой церкви твоей» Афанасія Пілліповіча, такі выкрывальны кант невядомага аўтара «Стих о преболезном воздыхании», расшыфраваны праф. В. Бялявым. Абодва яны накіраваны супраць сілай навязанай народу уніі і сведчаць аб фарміраванні ў беларускай музычнай культуры палемічнай традыцыі, цесна звязанай з палемічнай літаратурай, з гісторыяй народа.

Надзвычай сімптаматычны сам факт узнікнення ў канцы XVI, пачатку XVII стагоддзя новай традыцыі бытавога харавога спявання: канта — велічнага, урачыста-гімнападобнага або філасофскі-задумлівага.

Гістарычныя вытокі канта як асобага жанру масавага харавога песнапення нельга лічыць вывучанымі дасканала. Але сувязь яго з эпохай сялянскіх антыфеадальных паўстанняў праглядваецца і праслухоўваецца з дастатковай выразнасцю ў Францыі і ў Германіі, у Чэхіі і ў Польшчы, на Украіне і ў Беларусі [1]).

Мяркуючы па помніках далёкага мінулага, што дайшлі да нас, беларускі кант з самага пачатку развіваўся паралельна ў дзвюх асноўных формах, цесна звязаных адзін з адным. З аднаго боку гэта народная песня новага тыпу, урачыстае песнапенне ў руху мернага маршу. Такі народны кант, звязаны з працэсіямі і гімнамі гарадскіх цэхаў і брацтваў, фарміраваўся і распаўсюджваўся ў вуснай традыцыі.[1]) З другога боку, гэта культавы напеў тыпу энергічнага, узнёслага гімна (аднак не псалматычнага і не працяжна-распеўнага). Яго наватарская роля ў фарміраванні нацыянальнай традыцыі культавага спявання можа быць пастаўлена ў сувязь з пранікненнем народнапесенных уплываў у сферу культавай музыкі. Але і адваротны ўплыў пісьмова зафіксаванай новай культавай традыцыі на народную творчасць таксама не выключаны.

Звычайна такі ўплыў мае той ці іншы цэнтр свайго распаўсюджвання. Ці быў у Беларусі XVII—XVIII стагоддзяў такі цэнтр?

Відаць, адным з такіх спецыфічных ачагоў фарміравання і распаўсюджвання нацыянальнага пеўчага мастацтва ў Беларусі быў Супрасльскі манастыр, які ўваходзіў у той час у Пінскае епіскапства. Пры манастыры былі свае летапісцы, якія пакінулі нам у спадчыну супрасльскі рукапісны спіс так званага Першага беларускага летапісу (1519). Манастырскія дзеячы актыўна ўдзельнічалі ў літаратурнай палеміцы эпохі і выступілі са зборнікам артыкулаў, накіраваных супраць каталіцызму. Была арганізавана тут і свая друкарня. Але мала хто ведае, што тут друкаваліся не толькі кнігі, але і ноты. Паводле звестак, якія маюцца ў літаратуры, самая старажытная нотадрукарня ва ўсходняй Еўропе была заснавана на рубяжы XVII і XVIII стагоддзяў у Львове. Але ёсць падставы меркаваць, што найбольш ранняя нотадрукарня ва ўсходняй Еўропе не львоўская, а супрасльская. Мяркуючы па змесце супрасльскага зборніка «Песни благоговейные», друкарня, у якой ён быў надрукаваны, ва ўсякім выпадку, не менш старажытная. Знешні выгляд зборніка наводзіць на думку яшчэ пра больш раннюю яго дату выдання. Ён і ўвёў у зман археографаў **Мінскай бібліятэкі імя Леніна**. І на абцягнутым чорнай скурай драўляным пераплёце з'явілася наклейка: «XVI стагоддзе». Гэта, вядома, памылка. Але к канцу XVII стагоддзя, або — к самаму пачатку XVIII яго можна аднесці з дастатковай падставай.

Надзвычай паказальныя ў гэтых адносінах шматлікія гістарычныя звесткі, рассеяныя па ўсім зборніку. Такая песня пра забойства Іясафата Кунцэвіча ў 1623, або пра абарону горада Пачаева ад туркаў у 1670 годзе. Не менш паказальная і сама трактоўка гэтых падзей не як рэлігійных паданняў, а як гістарычных сведчанняў. Нездарма, песня пра забойства ворага беларускага народа Кунцэвіча ў зборніку названа гістарычнай.

Аб прыналежнасці супрасльскага песенніка да самага ранняга перыяду нотадрукавання сведчаць таксама і заключнае рыфмаванне «пристежение», у якім з усімі падрабязнасцямі паведамлялася, якія нотныя знакі («характыры») мела гэтая друкарня і якіх не мела.

У наборы значылася: цэлыя ноты («такты»), палавінныя, чвэрткі і восьмыя («Да увеси каждый!»). Калі ж патрабаваліся больш дробныя працягласці, дык...

«дели такты на полтакты, полтакты на чверти».

«Где ни тано, но инако
Есть ти пожеланно:
Не горее, но добрее
Пети невозбранно».

Змест зборніка надзвычай разнастайны. Тут і драматызаваныя сцэнкі, як «Песня на Рождество Христово, в ней же Рахиль плачет об отроках, Иродом убиенных, певец же её утешает».

ПЕВЕЦ: «Не плачь, Рахиль».

РАХИЛЬ: «Ах, як престати и не плакати» —

і гэтак далей, да канца, у выглядзе дыялогу.

Тут і характэрныя для свайго часу публіцыстычныя і маральна-дыдактычныя выказванні, з якіх асабліва становіцца зразумелым імкненне аўтараў-манахаў выцясніць з ужывання народныя зімнія святочныя песні «калядкі» і паставіць на іх месца «иные песни на Р. И. Х. вместо не богоугодных обычных коляд, простым певцам служащих». Побач з рыторыкай і адкрытай публіцыстыкай, тут і лірыка.

Трэба адзначыць, што ў гэты час аўтарству вершаў пачынаюць надаваць значэнне. Указанні на паэтычнае аўтарства манахаў базыліянскага ордэна сустракаюцца ў зборніку даволі часта: «па краегранесию — Иоан Вольский, Иоан Моравский, Василий Тарнавский, Дмитрий Левковский»... Або інакш: «дело законника чину Св. В. В.», г. зн. зноў — стварэнне манаха базыліянскага ордэна. Або — яшчэ прасцей: «Творение Иоанна Моравского».

Відаць, зборнік гэты паслужыў узорам для складання цэлага раду падобных, але толькі — у больш позні час. Некаторыя з іх вядомыя. Але іх роданачальнік, супрасльскі зборнік «песен благоговейных»... знік. Пасля вайны яго не стала ў бібліятэцы імя Леніна ў Мінску. Не знайшлі мы ўказання на яго і ў існуючых біяграфічных і даведачных выданнях. У Гістарычным музеі ў Маскве мы знайшлі толькі значна больш позднюю пачаеўскую рэдакцыю гэтага зборніка, перавыдадзенага з адпаведнымі патрабаваннямі эпохі зменамі, скарачэннямі, дадаткамі пад той жа назвай «Песни благоговейные» ў Пачаеве ў 1806 годзе. Паводле звестак Дзяржаўнага гістарычнага музея гэта кніга — «найбольш старажытны ўзор песеннікаў такога роду». Аб існаванні больш ранняй супрасльскай рэдакцыі ў музеі нават і не падазравалі!

Нашы, няпоўныя пакуль, звесткі аб гэтым выключна цікавым выданні супадаюць з іншымі дадзенымі аб ролі Супрасльскага манастыра ў развіцці пеўчай культуры ў Беларусі 17—18 стагоддзяў.

Ва ўкраінскім часопісе «Музыка» ў 1927 годзе быў змешчаны артыкул О. Дзбаніўскага, у якім упамінаўся «Супрасльскі ірмалогій» (зборнік культавых песнапенняў) «у музычным помніку 1601 года».

У «Апісанні рукапісаў Віленскай публічнай бібліятэкі, царкоўна-славянскіх і рускіх» Ф. Н. Дабранскага (Вільня, 1882) называецца цэлы рад дакументаў, непасрэдна звязаных з пеўчай традыцыяй Супрасльскага манастыра. Звяртае на сябе ўвагу «Песенный обряд, совершаемый вовремя так называемых «годинок», т. е. часов с гимнами и молитвами», «Годинки» гэтыя перакладзены ў Супрасле і ўключаны ў багаслоўнік, пісаны хуткапісам XVIII стагоддзя — прыблізна — каля 1760 года. Да XVIII стагоддзя адносяцца і трохгалосыя «каноны на воскресение Христово» — тры кнігі, у якіх змяшчаюцца партыі баса, тэнара, дысканта. З таго ж Супрасльскага манастыра і іншая — чатырохгалосая рэдакцыя «Канонаў» — для баса I, баса II, дысканта I і дысканта II. Упамінаюцца там і «Канты и литании» з Супрасльскага манастыра, якія па пісьму таксама адносяцца да XVIII стагоддзя. Агаворымся: у адрозненне ад зборніка «Песни благоговейные», усе гэтыя помнікі не друкаваныя, а рукапісныя. Цікава, што на працягу больш чым двух стагоддзяў да помнікаў музычнай пісьмовасці Супрасльскага манастыра праяўляецца павышаная цікаўнасць. Відаць, гэта звязана з тым, што ў нетрах Супрасльскага манастыра сфарміравалася своеасаблівая меладычная традыцыя, свой распеў. Нездарма ў адным з супрасльскіх нотных ірмолагаў (якія даследчыкі-археографы адносяць да XVII стагоддзя) падкрэсліваецца: «Херувимская супрасльского напеву».

Усе гэтыя дадзеныя дазваляюць гаварыць аб тым, што Супрасль не толькі ў кнігавыдавецкай і літаратурнай справе быў свайго роду нацыянальным цэнтрам, што тут фарміраваліся важныя элементы нацыянальнай беларускай пеўчай традыцыі XVII і XVIII стагоддзяў, традыцыі, якая заслугоўвае стараннага вывучэння, збірання і даследавання матэрыялу па крупінках.

Л. МУХАРЫНСКАЯ.

[1]) Рускі кант другой паловы XVII і XVIII стагоддзя носіць трохі іншы характар: у ім больш падкрэслены стылявыя рысы, звязаныя з гарадскім бытам.

[1]) Рысы гэтага народнага канта пазней выразна праслухоўваліся ў многіх беларускіх ваенных песнях, у песнях сацыяльнага пратэсту, у рэвалюцыйных гімнах.

У 1969 годзе музычная грамадскасць свету будзе адзначаць 150-годдзе з дня нараджэння класіка польскай музыкі Станіслава Манюшкі, які, як вядома, паходзіць з Беларусі і з'яўляецца аўтарам многіх твораў на беларускія тэксты.

Гэтымі днямі вядомы польскі музычны дзеяч доктар гуманітарных навук Мар'ян Фукс і старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР Рыгор Шырма наведалі вёску Убель Чэрвеньскага раёна, дзе нарадзіўся С. Манюшка, і ўсклалі кветкі да мемарыяльнай дошкі.

У васьмігадовай школе рыбгаса «Волма» адбылася сустрэча М. Фукса і Р. Шырмы з піянерамі. Гасцей віталі сакратар партыйнай арганізацыі рыбгаса «Волма» В. Нахамчык, настаўніца Д. Булойчак і вучаніца В. Серахан.

На здымку — Р. Шырма (справа) і Ф. Фукс каля мемарыяльнай дошкі С. Манюшку.

Фота Ул. КРУКА.

Равеснікі Іягана Гутэнберга

Невялікая па аб'ёме кніга — усяго 60 старонак. На белай супервокладцы — стылізаваны пад гатычны шрыфт надпіс «Каталог інкунабулаў» і старадаўняя гравюра, якая паказвае бібліятэку XV стагоддзя. Вялікія тоўстыя кнігі ў цяжкіх скураных вокладках. На разьбяным драўляным крэсле з высокай гатычнай спінкай сядзіць чытач. Прыгледзеўшыся, заўважаеш, што на галаве ў яго... блазенскі каўпак са званочкамі. Гэта гравюра — ілюстрацыя са славутай кнігі Себасцьяна Бранта «Карабель дурняў».

Лацінскі пераклад кнігі Бранта, выдадзены ў 1497 годзе ў Швейцарыі, — толькі адзін з інкунабулаў, якія захоўваюцца ў Навуковай бібліятэцы Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Лацінскім словам «інкунабулы» — «калыскавыя» — вучоныя назвалі кнігі, выдадзеныя ў XV стагоддзі, у самы перыяд перыяд кнігадрукавання, з часу вынаходніцтва Іяганам Гутэнбергам спосабу друкавання перастаўнымі літарамі і да 1500 года. Гэтыя кнігі маюць вялікае значэнне для гісторыі сусветнай культуры. Іх старанна збіраюць, захоўваюць і даследуюць вучоныя ўсяго свету.

У буйнейшых бібліятэках Савецкага Саюза ёсць выдатныя зборы кніг XV стагоддзя. Перш за ўсё гэта збор інкунабулаў Навуковай бібліятэкі Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. У ім усяго 84 такія кнігі, але яны надзвычай каштоўныя. Многія кнігі выдатна афармлены. Гэта і самая старая з іх, надрукаваная да 1470 года, нямецкая Біблія з выкананымі ўручную цудоўнымі маляўнічымі ініцыяламі і дэкаратыўнымі ўпрыгожаннямі, і той жа «Карабель дурняў», і папулярная ў тыя далёкія часы кніга Бернарда Брэйдэнбаха «Падарожжа ў святую зямлю» з вельмі цікавымі гравюрамі мастака Эрхарда Рэйвіха, сярод якіх вылучаецца паўтараметровая панарама Венецыі.

Сярод інкунабулаў універсітэта многа выданняў па медыцыне, праве, ваеннай справе, каменціраваныя выданні антычных аўтараў. Ёсць там і адзіная, набраная кірыліцай, — першынец славянскага кнігадрукавання «Осмагласнік». Яна была выпушчана ў Кракаве ў 1491 годзе друкаром Швайпольтам Феолем. За выданне «ерэтычнага» праваслаўнага твора Феоля прыцягнулі да суда інквізіцыі. Каталіцкае духавенства ганялася за ножным экземплярам кнігі. Уцалела вельмі мала: да апошняга часу ў СССР было вядома ўсяго чатыры экземпляры, за граніцай іх няма зусім. Пяты экземпляр «Осмагласніка», які цяпер у калекцыі універсітэта, быў знойдзены зусім нядаўна, у 1965 годзе ў вёсцы Заазер'е Халмагорскага раёна Архангельскай вобласці. Пры яго вывучэнні высветлілася, што гэта найбольш поўны экземпляр з усіх існуючых.

Да збору інкунабулаў бібліятэкі Ленінградскага універсітэта звяртаюцца гісторыкі, юрысты, мастацтвазнаўцы. Цяпер, пасля выхаду каталога, магчымасці навуковага даследавання гэтага збору становяцца яшчэ большымі. З любоўю выдадзены і добра ілюстраваны каталог стане ўпрыгожаннем бібліятэк многіх аматараў гісторыі кнігі.

Якаў БУТОЎСКІ (АДН).

ЭСТАФЕТА СВЕТЛЫХ ПАЧУЦЦЯЎ

НАТАТКІ АБ НОВЫХ ФІЛЬМАХ

НАШ кінематограф увесь час вяртаецца да гісторыі краіны, да мінулых этапаў жыцця Савецкай дзяржавы. Аднаўляючы старонкі мінулага, мастакі ідуць рознымі шляхамі. Адны звяртаюцца да эпасу, які здольны перадаць размах народнага руху, рэвалюцыйны парыў мас. Іншыя лічаць за лепшае жанр гістарычнай драмы. А трэція паказваюць жыццё ў падрабязнасцях і дэталях, у псіхалагічным даследаванні характараў. Кожны з гэтых шляхоў плённы, калі аўтары не проста рэстаўрыруюць падзеі, а бяруць з іх вялікую праўду, іх павучальны сэнс, калі экран, адлюстроўваючы мінулае, адкрывае ў характарах герояў перспектыву будучага.

«ТАШКЕНТ — ГОРАД ХЛЕБНЫ»

... Цяжкія дваццатыя гады. Яшчэ не залечаны раны вайны, не наладжана разбураная сельская гаспадарка. Як новая бяда, зваліўся на народ голад. Ледзь прыкрытыя саломай сялянскія хаты. Пусты хлеў — вымерла, загінула жывёла. Мізэрныя рэшткі ежы, што знясіленыя недаяданнем дзеці з прагнасцю выскрабаюць з міскі.

Гэта сумная карціна з усёй сваёй суровай праўдзівасцю адкрываецца гледачу новага фільма ўзбекскага рэжысёра Шухрата Абасава — «Ташкент — горад хлебны» (сцэнарый — Андрэя Канчалоўскага). Аднайменная кніга Аляксандра Няверава — адзін з папулярных твораў савецкай класічнай літаратуры — заваявала прызнанне сваім рэалізмам, той верагоднасцю мастацкай манеры, якая выключае і празмернае згушчэнне фарбаў, і сентыментальнасць.

Падарожжа юнага Мішкі з прыволжскага краю ў «хлебны горад» Ташкент не толькі сюжэтная канва фільма, але і яго змест. Далёкая дарога становіцца той жыццёвай школай, якая фармуе свядомасць хлопчыка, правярае яго душэўную «трываласць».

Першая праверка — на вернасць. Вернасць таварышу, з якім разам пусціліся ў дарогу. Сярожка, які хутка спасаваў перад цяжкай дарогай, выклікае ў Мішкі не толькі зразумелыя прыкрасць і раздражненне, але і... спачуванне. Ён пакрыкае на хлапчука, палохае яго. Але шкадуе, не кідае аднаго. Толькі смерць Сярожы, скошанага тыфам, разлучае сяброў.

Другое выпрабаванне — выпрабаванне мужнасці, пачуцця класавага абавязку. Спачатку Мішка не прызнаўся начальніку, што ведае бандыта Сцяпана Дранава, якога шукаюць чэкісты. Проста ён збаяўся, успомніў, як Сцёпка пагражаў прыдушыць яго, і спалохаўся. А потым зразумеў: не мае права маўчаць, утойваць бандыта. І рынуўся ў бой...

З рознымі людзьмі сустракаецца ў дарозе Мішка. І з такой добрай душой, як медсястра шпіталя, што накармліла, супакоіла, дапамагла трапіць у бітком набіты поезд. І з такім чэрствым, карыслівым людам, як вагонныя пасажыры-спекулянты. І з бязлітасным беспрытульнікам. І з узбекскім хлопчыкам-сіратой, які аказаўся адданым таварышам. Грубае, дрэннае, з якім сутыкнуўся Мішка, не нанесла непаправнай траўмы, але зрабіла жорсткім Мішкава сэрца. Дабро для яго засталося дабром, а зло — злом. Ён здолеў разабрацца, дзе фальш, а дзе праўда, каму трэба дапамагаць, а з кім — змагацца. З жыццёвага, маральнага выпрабавання герой выйшаў пераможцам.

Але не толькі ў гэтым значэнне і станоўчы прыклад вобраза. Фільм падкрэслівае ў юным Мішку пачуццё гаспадара сваёй зямлі, працаўніка, галавы сям'і. Не эгаізм, не жаданне самазахавання штурхнулі Мішку ў дарогу, а боль і турбота за галодную сям'ю, зямля, што зарастала пустазеллем... Нездарма фільм вянчае кадр, дзе герой размашыстым жэстам раскідвае па ўзаранай глебе каштоўныя зерні. Добрыя ж зерні, вядома, не могуць не ўзыйсці!

«ТРОХКУТНІК»

Падобныя ідэі — у армянскім фільме «Трохкутнік», які па сцэнары Агісі Айвазяна паставіў рэжысёр Генрых Малян.

Ён зроблены ў форме вольнага расказу ад асобы хлопчыка — Овіка, сына каваля Усты Мукіча, і дае магчымасць затрымацца на некаторых цікавых дэталях быту, абстаноўкі, характэрных для тых часоў, што для многіх гледачоў яшчэ нядаўна былі часамі іх юнацтва, а сёння ўжо сталі гісторыяй.

Перагортваючы гэту старонку мінулага, аўтары перш за ўсё імкнуцца выявіць арганічныя сувязі жыцця герояў з жыццём усёй краіны, раскрыць чалавечую прывабнасць і мудрага Усты Мукіча, і сціплага Мкрціча, і жывога, нецярпліваго Гаспара, і гаваркога Васо, і маўклівага Мко. Кожны з іх — своеасаблівы, выразны характар, а ўсе разам — дружная сям'я працаўнікоў, з'яднаная агульнымі прынцыпамі справядлівасці, працоўнага гонару, высокага абавязку.

Ненавязлівая спакойная манера апавядання (можа, недзе ў другой частцы празмерна запаволеная, зацягнутая) стварае адчуванне натуральнай плыні жыцця, у якой ёсць радасць і гора, весялосць і смутак. Здаецца, толькі адсвяткавалі вяселле Мко і Люба, як у іх лёс уварвалася вайна. І побач з гэтай праўдай падзей — праўда савецкіх характараў: маладажоны, не раздумваючы, ідуць добраахвотнікамі на фронт...

Пачуццё павагі і добрай прывязанасці адчувае глядач да герояў «Трохкутніка». У іх ён бачыць маральны прыклад, душэўную цэльнасць.

Ніна ІГНАЦЬЕВА, кінакрытык (АДН).

ЦЫРК ЗАПРАШАЕ...

Новы сезон у мінскім цырку пачаўся «Міжнароднай праграмай». На арэне выступаюць гімнасты Трончавы і велафігурысты Дзімітровы з Балгарыі, акрабаты Очаі з Венгрыі, эквілібрысты на першах Стэльян з Румыніі, дрэсіроўшчыкі Мірэк і Тоня Млчаковы з Чэхаславакіі, артысты Энгелос і Ікарыс з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, паветраныя гімнасты Кузняцовы і жакеі-наезнікі Сабалеўскія з Савецкага Саюза. Увесь вечар на манежы клоуны Васіль Арлоў, Іван і Аляксандр Траіцыны.

На здымку — «Паветраны палёт» выконваюць артысты з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі Энгелос.

ЯШЧАРЫ І РАМОНКІ

Калі Анры Русо, пошлінны чыноўнік, захапіўшыся жывапісам, намаляваў, як умеў, некалькі карцін, якія выставілі ў «Салоне незалежных» у 1886 годзе, парыжская публіка была шакіравана.

Але праз сорак гадоў на Міжнароднай выстаўцы ў Парыжы з'явіліся невялікія кавалкі паперы з мудрагелістымі і наіўнымі малюнкамі ўкраінскай сялянкі Марыі Прымачэнкі, і Парыж вітаў яе.

Як-ніяк час бярэ сваё. Менш чым за паўстагоддзя ў жыццё мастацтва ўвайшлі мастакі-самавукі, мастакі асобага складу і спецыфічнага светапогляду, якіх ніколі раней усур'ёз не прымалі.

Прымачэнка жыла ў глухім далёкім сяле Балотня. У дзяцінстве перанесла цяжкую хваробу, многія гады была прыкавана да ложка, на ўсё жыццё засталася інвалідам. Тады ў глыбіні яе душы прачнуліся сумныя і невыразныя вобразы істот, якіх яна ніколі не бачыла, ды і ніхто ніколі не бачыў. Вобразы спелі ў ёй, раслі, патрабавалі выхаду.

Як маляваць? У акцёраў гэта называецца прыстасаваннем. Прыстасаваннем яе было шво, якому яна была навучана з маленства. Не ніткай — хімічным алоўкам малявала яна крыжык, зорачку і кветку з шасцю пялёсткамі.

Гэта стала тэхнікай, знакам, які яна прыстасавала да сваёй фантазіі. Фантазіі выходзілі з-пад яе рук у выглядзе дзіўных звяроў.

Звяроў яна малявала ўсё жыццё. Звяроў і кветкі. Іншы раз — сюжэтныя малюнкі, павучальныя, як байкі. Фантасмагарычныя прытчы.

Потым была вайна. Парыжскі дыплом згубілі, здарылася так, што пра Прымачэнку забылі, проста забылі, а напамінаць аб сабе яна не ўмела. Адкрылі яе нанова толькі некалькі гадоў назад. Адкрыўшы, не адразу здагараліся, што гэта не сенсацыя дня, не газетны сюжэт, а сталае і магутнае мастацтва.

У сяле яна прывучала дзяцей маляваць. Зараз ў Балотні — цэлая яе школа. Работы яе школы прывезлі ў Маскву, у Дом дружбы.

У нас у мове, ды, напэўна, і ў любой іншай мове, няма такіх слоў, каб хоць прыблізна перадаць глухую, страсную, затоеную і выяўленую адначасова стыхію, якая бушуе на гэтых аглушальна яркіх палотнах, што вызываюць у памяці кірмаш Гогена, жывапіс першабытных, дзіцячы малюнак і цыганскае рыззё. Мы можам гаварыць пра іх: рэалізм, фантазію, пераасэнсаванне і гэтак далей. Але ўсе гэтыя словы, блізкія нашаму разуменню, бясконца далёкія ад патаемнай сутнасці ўсіх карцін школы Прымачэнкі.

Жывёла з мордай, падобнай на твар шамана ў экстазе, яна адзета ў мудрагелістыя спадніцы з кветкамі ў зборку, і задняя палавіна схавана ў пышны малінавы парасон, усыпаны жоўтым і аранжавым насеннем. Гэта «дзікі певень».

А вось карціна, якую можна назваць жанравай. Тут ёсць рака, поўная рыбы, і суша, залепленая дрэвамі. І дом з вокнамі ў ручнічках і фіранках, а сам дом мае форму вока. Сядзіць на беразе мужык з вудачкай. Называецца гэтая раскоша «Жыццё на Марсе».

Не, вядома, нельга перакласці на словы сутнасці першабытнай магутнасць. Мы не ўмеем расказаць аб дзетародным сляпой сіле прыроды, якая нараджае лішнія формы, якая можа дазволіць сабе царскую прыхамаць і выдумку капрызнага чорта.

І тады з зямлі палезуць не толькі рамонкі і памідоры, але земляныя прыгажуні, дзікія пеўні, лесуны, паркалёвыя зайцы і касмічная ракета, па-свойску ўпрыгожаная ручнікам.

Выстаўка рабіла ўражанне вясёлай шалёнай бахчы, якой надакучыла вырошчваць кавуны, і яна разрадзілася ўсім гэтым нябачаным, шчодрым, ветлівым уражаннем.

Мы ведаем іншыя вопыты — у югаслаўскім сяле, у Хлебене, салдат-адстаўнік Іван Генераліч прыцягнуў сваімі малюнкамі на шкле ўвагу аднавяскоўцаў, і хутка ўзнікла хлебенская школа, вядомая ўсяму свету.

Гіпнатычная сіла ўздзеяння мастакоў тыпу Прымачэнкі — велізарная.

Кіеўскія мастакі А. Рыбачук і В. Мельнічэнка ў Палацы піянераў зрабілі цэлую сцэну па матывах Марыі Прымачэнкі. Тут такія дрэвы, як у яе, і на задніх лапах стаяць ваўкі — прамыя нашчадкі яшчараў, і ў іх скурах буйныя, круглыя каменні.

Бадай, я не памылюся, сказаўшы, што прафесіянальнае прыкладное мастацтва Украіны апошняга перыяду будзе адчуваць уплыў Марыі Прымачэнкі.

А, можа, дакладней будзе сказаць: зачараваныя ёю. Бо, калі і ўцалела ў чым-небудзь яшчэ чараўніцтва на зямлі, вядома, апошні прытулак яго — мастацтва.

Ірына УВАРАВА (АДН).

УНІКАЛЬНАЯ ЗНАХОДКА

Балгарскі трактарыст з сяла Ізграў Варненскай акругі нечакана для сябе стаў археолагам. Аручы, ён раптам падчапіў нешта плугам. Раскапаўшы зямлю, трактарыст убачыў рэшткі старажытнай сцяны і мармуровую статую.

Знаходку перадалі ў Варненскі археалагічны музей. Яго супрацоўнікі вызначылі, што статуя вярхоўнага бога рымлян — Юпіцера адносіцца да эпохі рымскага панавання (II—III стагоддзе нашай эры).

Вышыня статуі паўтара метра — шырыня — 80 сантыметраў. Бог магутнасці і славы рымлян вылеплены як сімвал несакрушальнасці: яго нага топча пераможанага быка, зроблена невядомым скульптарам з вялікім майстэрствам, а побач арол з распасцёртымі крыламі — свяшчэнная птушка, якая падкрэслівае сілу і непераможнасць Юпіцера.

Такога роду статуя ў Балгарыі знойдзена ўпершыню. На месцы яе адкрыцця вядуцца археалагічныя работы, якія, несумненна, прывядуць да новых знаходак.

Д. БАЧАРОЎ, карэспандэнт ТАСС.

Сафія.

ЦІ ВЫПІСАНА Ў ВАС НА НАСТУПНЫ ГОД ГАЗЕТА

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»?

З 1-га ВЕРАСНЯ ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ПАЎСЮДНА

ПАСТАРАЙЦЕСЯ АФОРМІЦЬ ЯЕ СВОЕЧАСОВА

ТЭЛЕБАЧАННЕ

17 верасня

Першая праграма. 9-30 — «Тэлебачанне — школе». Фізіка. 10-ы клас. «Паняцце аб патэнцыяле». 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для школьнікаў. «Жыццё выдатных людзей». Тэадор Нэтэ (М). 10-45 — сімфанічны канцэрт (М). 12-00 — тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя» (М). 12-30 — «Пасля вялікай вайны». Тэлевізійны фільм (М). 17-00 — «Навіны». 17-05 — праграма перадач. 17-10 — для дзяцей. На кубак імя Ю. Гагарына. Сустрэча дзіцячых футбольных каманд «Метэор» — «Камета». 18-10 — «Першы савецкі ордэн». Да 50-годдзя з дня ўстанаўлення ордэна Чырвонага Сцяга. 18-30 — дзіцячы экран. «Звяры на арэне». Тэлевізійны фільм. 18-40 — за фасадам «свабоднага свету». «Што такое «хіпі». Гутарка каментатара У. М. Лісіцкага. 19-00 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Урачыстае адкрыццё дзён Брэсцкай вобласці ў Мінску. У перапынку — «Эстафета юбілейнага года». Дні Брэсцкай вобласці ў Мінску. 21-50 — «Выклікаем агонь на сябе». Тэлевізійны мастацкі фільм. Першая серыя. 23-35 — для студэнтаў вну. «Вышэйшая матэматыка». III курс.

Другая праграма. 17-05 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — акадэмія сельскагаспадарчых ведаў (М). 17-45 — «Фізкультура і спорт» (М). 18-15 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Пошта Алёшы і Цёпы» (М). 18-45 — «Свет сацыялізма» (М). 19-15 — літаратурны тэатр. «Сапраўдны мужчына складаецца з мужа і чына». Па ранніх апавяданнях А. П. Чэхава. Перадача з Ленінграда. 20-15 — «Гэта песні твае, камсамол!» (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — «Гамлет». Мастацкі фільм. Першая серыя (М). 23-00 — «Толькі факты». Праграма перадач.

18 верасня

Першая праграма. 9-30 — «Тэлебачанне — школе». Заалогія. 7-ы клас. «Біялагічныя асаблівасці пчол». 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — «Здароўе» (М). 10-30 — фестываль фільмаў, прысвечаны 50-годдзю ВЛКСМ. «Пяцігодкі» (М). 11-45 — «Карусель» (М). 12-30 — «Табе, юнацтва!». Перадача з Чарнаўцоў. 17-00 — «Навіны». 17-10 — праграма перадач. 17-15 — па роднай краіне. «Вуліцы гавораць». Кінанарыс.

Насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Праграма Брэсцкай студыі тэлебачання. 17-40 — тэлевізійныя навіны. 17-55 — для дзяцей. «Вясёлыя мінуткі». 18-20 — «Радавы рэвалюцыі». Тэлевізійны фільм. 18-35 — «За шчасце народнае». Перадача з краязнаўчага музея. 19-05 — «Агонь бессмяротнасці». Кінарасказ. 19-20 — «На шляху перамог». Выступленне сакратара Брэсцкага абкома КПБ С. М. Шабашова. 19-40 — «Застаюся на Днепра-Бузе». Кінанарыс. 20-00 — «Равеснік». Маладзёжны агляд. 20-50 — «Эстафета юбілейнага года». Дні Брэсцкай вобласці ў Мінску. 21-05 — «На музычнай хвалі». 21-15 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 22-00 — «Выклікаем агонь на сябе». Тэлевізійны мастацкі фільм. Другая серыя. 23-15 — «Толькі факты». Праграма перадач. 23-25 — для студэнтаў вну. «Фізіка». III курс.

Другая праграма. 17.05 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — Іграе аркестр лёгкай музыкі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта (М). 18-00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 19-30 — «Насельніцтву пра грамадзянскую абарону» (М). 19-45 — першынство СССР па хакеі. «Тарпеда» (Горкі) — «Спартак» II і III перыяды. Перадача з г. Горкага. 21-15 — «Гумарэскі В. Катаева». Фільм-канцэрт. 22-00 — «Гамлет». Мастацкі фільм. Другая серыя (М).

19 верасня

Першая праграма. 10.05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — тэлевізійны тэатр для дзяцей В. Герасімава. «Памяць пакаленняў» (М). 11-20 — для школьнікаў. «Самаробка». Перадача з Іжэўска. 12-00 — праграма каляровага тэлебачання. «Мелодыі дружбы» (М). 16-50 — «Навіны». 17-00 — праграма перадач. 17-05 — «Камсамолу прысвячаецца». Рэпартаж з Рэспубліканскай мастацкай выстаўкі. 17-25 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Станаўленне». Сімфанічны канцэрт. Музыка беларускіх кампазітараў 20-х—30-х гадоў.

Насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Праграма Брэсцкай студыі тэлебачання. 18-25 — «Брэст, вясна 68». Тэлевізійны фільм. 18-40 — «Святло майго завода». Рэпартаж з Брэсцкага электралямпавага завода. 19-00 — «Над Гарынню-рэкой». Тэлевізійны фільм пра калгас імя Леніна Столінскага раёна. 19-20 — «Буг». Літаратурна-мастацкі часопіс. 20-10 — «Дружба не ведае рубяжоў». Тэлевізійны фільм. 20-25 — «Пра радасць спяваюць цымбалы». Музычная перадача. 20-50 — «Эстафета юбілейнага года». Дні Брэсцкай вобласці ў Мінску. 21-05 — «На музычнай хвалі». 21-15 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 22-00 — «Выклікаем агонь на сябе». Тэлевізійны мастацкі фільм. Трэцяя серыя. 23-35 — «Толькі факты». Праграма перадач. 23-45 — для студэнтаў вну. «Фізіка». III курс.

Калектыў Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача выказвае глыбокае спачуванне намесніку дырэктара тэатра па арганізацыі гледача Бялевіч Софіі Міхайлаўне з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці бацькі.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У.